© PDF: Kamunikat.org 2013 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

ГРАМАДЗКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА ЗАСНАВАНА Ў 1920 г.

ПАГОНЯ

№ 8 (155) 23 - 29 лютага 1996 г. Кошт 1000 рублёў

КАБ ТЫЯ КАМІСІІ ДЫ Ў ПЛУГ - ст. 2.

ВЯЛІКІ КРЫМІНАЛ - ст. 3.

НЕГРЫ Ў АСТРАВЕЦКІХ ЛЯСАХ - ст. 8.

ПРАГРАМА ТЭЛЕБАЧАНЬНЯ НА ТЫДЗЕНЬ: Менск - Варшава - Масква - Санкт-Пецярбург.

ЖЫЦЬ СТАЛА ВЕСЯЛЕЙ. ЖЫЦЬ СТАЛА ЛЕПШ?

Я не ўяўляю, як пра гэта можна напісаць, таму што немагчыма было што-небудзь пабачыць. Такога наплыву людзей Пышкі яшчэ ня бачылі: час сказаць аб празмернай экалагічнай нагрузцы на гэты цудоўны лесапарк. Сабраліся гарадзенцы ў Пышках у мінулую нядзелю з нагоды...

А вось і не зразумела, з якой нагоды! Арганізатары - гарадзенскі гарадскі і раённыя выканкамы - назвалі мерапрыемства «Сьвятам зімы і адпачынку». Іншыя казалі, што гэта - «Провады зімы». Трэція былі ўпэўнены, што прыйшлі адзначаць Масьленіцу, хаця Масьленіца павінна быць у чацьвер за тыдзень да вялікага посту. І яшчэ былі плакаты, якія запэўнівалі, што праводзяцца завочныя спаборніцтвы з канадзкім горадам Пітэрбора! Былі і такія, якія лічылі, што гэта проста кірмаш.

Адразу зазначу, што ўсе мелі рацыю. На гэтым мерапрыемстве былі элементы і спаборніцтваў, і кірмашу, і Масьленіцы. Кожны мог выбраць любімы занятак.

А ці мог? Я мяркую, у Пышкі прыйшло каля 100 тысяч чалавек (прынамсі, ніяк ня менш 50 тысяч). Цэнтральная прысада лесапарку нагадвала тралейбус у гадзіну-пік. Прасунуцца хоць на тры крокі было вельмі цяжка, тым больш, што засьнежаны шлях тысячы падэшваў адпаліравалі да люстранога бляску. Людзі ўвесь час падалі, а натоўп напіраў. Дзякуй Богу, абыйшлося без ахвяраў.

Далёка ў абодва бакі ад цэнтральнай сьцяжыны ўтварылася мноства клубаў па аднолькаваму інтарэсу: народ выпіваў і закусваў. Ва ўсіх краінах (акрамя нашай) існуе такое паняцьце, як пікнік - любая кампанія можа прыйсьці, напрыклад, у гарадзкі парк, разьмясьціцца на траўцы і аддаць належнае. У нас за гэта караюць, акрамя вось такіх сьвятаў.

Я не хачу крытыкаваць, гэта было б абразай у адносінах да дзесяткаў тысяч гарадзенцаў, якія прыйшлі ў Пышкі. Я проста хачу разабрацца: жыць стала весялей, але ці стала лепш?

Алесь НАРБУТ.
Фота В.УЛАДАСЕВІЧА

ЗАХАД НАМ ДАПАМОЖА?

21-22 лютага ў Горадні праходзіў семінар «Складаньне праекту для прыцягненьня фінансаваньня праграмаў неўрадавых арганізацый, арганізаваны Фондам Міжнароднага Партнёрства COUNTERPART пры садзеяньні гарадзенскай Асацыяцыі маладых навукоўцаў «Віт». Гэтыя заняткі ўваходзілі ў цыкл семінараў, якія праводзяцца Фондам на Украіне, Беларусі і ў Малдове з мэтай падтрымкі недзяржаўных арганізацый і азнаямленьня з амерыканскім досьведам працы непрыбытковых арганізацый.

На працягу двух дзён сябры гарадзенскіх і рэспубліканскіх грамадзкіх арганізацый («Чырвоны крыж», «Аб'яднаньне беларускіх скаўтаў», «Паходня», Асацыяцыя «Вера» (аб'ядноўвае сем'і, у якіх ёсьць дзеці-інваліды), Заходнебеларускі гуманітарны цэнтр дасьледаваньняў Усходняй Эўропы уніяцкай суполкі і іншыя) разглядалі розныя асьпекты пабудовы і разьвіцьця грамадзкіх арганізацый, а таксама пытаньні, зьвязаныя з складаньнем эфектыўных, заснаваных на грамадзкіх патрэбах праектаў.

В.Р.

ЦУКЕРКІ ПА 100 ТЫСЯЧ ЗА КІЛАГРАМ

Летась аграфірма «Дзітва» адчыніла ў всёцы Дзітрыні кандытарскі цэх. Было спланавана выпрацоўваць штогод 225 тон розных цукерак, але з надыходам зімы эканамісты палічылі, што кожны кілаграм такіх цукерак мае сабекошт у 100 тысяч рублёў. Вытворчасьць давялося спыніць.

На 80% панізіўся выпуск бульбасаджалак на заводзе «Лідсельмаш». На 53% зьменшылася рэалізацыя канцэнтратаў з камбінату збожжа прадуктаў. На 35% сёлета менш рэалізуецца кандытарскіх вырабаў.

Вольнае падзеньне прамысловасьці працягваецца.

Ігнат ХІТРОВІЧ.

ГАРАДЗЕНСКІЯ АБУТНІКІ НАПЯРЭДАДНІ СТРАЙКУ

Ня выключана, што 26 лютага ў Горадні пачнецца першы ў гэтым годзе рабочы страйк.

Пра гэта гаворыцца ў лісьце працоўнага калектыву акцыянернага таварыства «Гроднаабутак», накіраваным Аляксандру Лукашэнку. Рабочыя патрабуюць расьсьледаваньня дзейнасьці былога кіраўніцтва прадпрыемства, якое давяло некалі квітнеючую абутковую фабрыку да мяжы развалу.

Які ўжо месяц зарплата на прадпрыемстве выдаецца абуткам, ды і то нерэгулярна. 1 сакавіка павінна ўступіць у сілу судовае рашэньне аб перадачы за запазыку фірме «Белтрейд» базы адпачынку прадпрыемства і філіялу ў Мастах. Былое ж кіраўніцтва, атрымаўшы свае мільёны за выкупленыя акцыі «Гроднаабутку», у гэтай сітуацыі засталося як бы ні пры чым. Як будзе разьвівацца сітуацыя далей - у наступных нумарах «ПАГОНІ».

В.ДРЭМА.

ГЭТЫМ РАЗАМ ЗЬБІВАЦЬ ПАЛЕНАВАЛІСЯ

19 лютага ў 16.00 у Лідзе па вул.Аляксандра Неўскага за нейкіх 500 метраў ад штабу расейскай дывізіі ракетных войскаў стратэгічнага прызначэньня прызямліўся польскі аматарскі радыёзонд.

Цікава, куды на гэты раз глядзела беларуская супрацьлаветраная абарона: ці баялася аканфузіцца, як з амерыканскім шарам, ці проста, як заўжды, нічога ня бачыла.

Што датычыць самога зонду, то ён «арыштаваны» мясцовым КДБ і дасьледуецца на прадмет шпіёнскай апаратуры.

Да ведама: на зоньдзе была паперка, якая абяцала 30 тысяч узнагароды таму, хто паведаміць, дзе ўпаў зонд. Адна лідзкая жанчына пасьпела выхапіць гэтую паперку раней КДБ. Ды толькі вось зараз гадае: чаго 30 тысяч - злотых ці долараў?

С.РУБАЛЬСКІ.

ЦІ ВАРТА РВАЦЬ НА НАС КАШУЛЮ?

З 1 сакавіка ў Горадні ўводзяцца камерцыйныя аўтобусныя маршруты, якія пасьля 21 гадзіны будуць замяняць звычайныя гарадзкія аўтобусы. Плата за праезд у гэтых «таксаматорах» будзе складаць, па папярэдніх зьвестках, тры тысячы рублёў.

Прымаючы гэтае рашэньне, гарвыканкам кіраваўся Указам прэзідэнта ад 12 ліпеня 1995 году,. згодна якога, да канца 1996 году памер дзяржаўных датацый на транспарт не павінен перавышаць 20% усіх выдаткаў.

У Горадні гарадзкі аўтобусны парк самастойна пакрывае толькі 52 працэнты выдаткаў, а тралейбуснае ўпраўленьне - 39 працэнтаў.

Рашэньне гарвыканкаму, аднак, не знайшло падтрымкі ў абласных уладаў, у прыватнасьці, Аляксандра Дубко, які зьбіраецца з гэтай нагоды сустрэцца з мэрам горада Генрыхам Крупенкам. Чым скончацца гэтыя перамовы - даведаемся 1 сакавіка.

В.Р.

ШТО СЬВЯТКУЮЦЬ БЕЛАРУСЫ 23 ЛЮТАГА?

23 лютага ў нашых календарах воляй парламанту пазначана як «Дзень абаронцаў Айчыны». Дата аўтаматычна перанесена з савецкіх часоў, дзе яна прывязвалася да славутай перамогі Чырвонай Арміі над немцамі пад Псковам і Нарвай. Расейскія навукоўцы дасканала вывучылі гэтую падзею і даказалі, што ніякай перамогі ў гэты дзень пад Нарвай не было. Самай значнай падзеяй гэтых дзён была «перамога» некалькіх дзесяткаў п'яных матросаў над купкай п'яных немцаў, у выніку якой «пераможцы» здабылі цыстэрну сьпірту. Але ні Нарва, ні 23 лютага тут ні пры чым.

Што ж датычыць Беларусі, дык тут справа выглядала яшчэ прасьцей. 18 лютага 1918 году немцы перайшлі ў наступ па ўсім фроньце. Бальшавікі далі дзёру. Пра тэмпы ўцёкаў сьведчыць такі факт: бальшавікі кінулі Менск 19 лютага, а немцы ўвайшлі ў яго толькі 25 лютага. Нямецкі наступ быў на тэрыторыі Беларусі больш падобны на шпацыр. Тут ня тое, што не было ніякага супраціву, асабліва, падкрэсьлім, 23 лютага, а мо ніводзін сабака на гэтых немцаў не забрахаў. Немцы занялі Беларусь да Дняпра, мяркуючы садраць за яе з Расеі шэсьць мільярдаў рублёў кантрыбуцыі. Праўда, далей гісторыя зрабіла чарговы кульбіт, але нас гэтыя падзеі ўжо не цікавяць. Мы высьветлілі, што прывязваць дату 23 лютага да падзей на Беларусі 1918 году нельга.

Але, як сказаў Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка, «...ня ўсё толькі кепскае зьвязана ў Германіі з вядомым Адольфам Гітлерам...» Магчыма ён меў на ўвазе, што і на Беларусі з Гітлерам зьвязана ня ўсё толькі кепскае. Прынамсі, менавіта падзеі Другой сусьветнай вайны даюць нашаму прэзідэнту і яго краіне хоць нейкую гістарычную падставу для сьвяткаваньня 23 лютага як Дня абаронцы Айчыны. У гэты дзень, 23 лютага, Генеральны камісар Беларусі, гаўляйтэр фон Готберг «у адказ на прапанову прэзідэнта БЦР ад 18.02.1944 г.» выдаў загад аб стварэньні Беларускай краёвай абароны (БКА).

Стварэньне БКА - зьява, безумоўна, супярэчлівая. З аднаго боку, яна стваралася пад эгідай акупантаў, з ласкі немцаў і для іх паслуг у барацьбе з бальшавікамі. З другога - па духу яна была больш беларуская, чым беларускія часткі часоў БССР і, канешне, чым Узброеныя Сілы Рэспублікі Беларусь перыяду нашага каланіяльнага суверэнітэту.

Пра БКА напісана дастаткова, каб сёньня яшчэ раз паўтарыць яе гісторыю, але пры яе стварэньні меў месца адзін феномен, пра які варта было б сказаць і сёньня, калі ментальная прастора насычана самай рознай інфармацыяй пра любую гістарычную падзею.

Феномен заключаецца ў наступным. Да стварэньня БКА на баку немцаў не было ніводнага беларускага вайсковага аддзелу. Колькасьць беларускай паліцыі па зьвестках Юрыя Туронка з улікам усіх складовых частак дасягала ня больш 50 тысяч чалавек. Але А.Літвін аспрэчвае гэтую лічбу. Згодна з яго зьвесткамі «па стану на 29.02.1944 г. вышэйшаму начальніку СС і паліцыі «Цэнтр» ў Беларусі падпарадкаваліся ўсяго каля 30 тыс.чалавек, уключаючы нямецкія, латышскія, літоўскія, беларускія і іншыя паліцэйскія фарміраваньні, а, таксама , службу парадку». Гэта значыць, што ўласна беларускіх паліцыянтаў было парадку 20-25 тысяч. Гэта ўсё, што немцы выцісьнулі з беларусаў.

Зусім нечаканай сітуацыя складвалася пад час мабілізацыі ў БКА. Па загаду Астроўскага на прызыўныя пункты было адразу склікана каля 40 тысяч чалавек. Язэп Найдзюк і Іван Касяк сьведчаць, што толькі за першыя тры дні мабілізацыі мабілізацыйныя камісіі прайшлі каля 28 000 чалавек. Пра гэты посьпех мабілізацыі пісалі ўсе тагачасныя газеты. Прызыўнікі зьяўляліся нават з раёнаў, дзе гаспадарылі партызаны. Не было праблемаў і з камандаваньнем.

У чым жа прычына таго, што за тры дні мабілізацыі БКА набралі болей, чым за тры гады ў паліцыю. Адказ бачыцца ў наступным. Для беларусаў у чарговы раз наступіла тупіковая сітуацыя. Ніводзін сьвядомы беларус не чакаў нічога добрага ад бальшавікоў. Досьвед стасункаў з імі няўмольна даводзіў, што пры бальшавіках беларусаў чакае ідэалагічнае, нацыянальнае і культурнае рабства. А нязгодных, ці тых, хто засьвяціўся хоць у нейкім супрацоўніцтве з немцамі, чакае ГУЛАГ. Нічога добрага не чакалі беларусы і ад палякаў. Чаго вартыя былі толькі іх заявы, што прз 10 гадоў на Беларусі не застанецца ніводнага, хто размаўляў бы па-беларуску. Да заяваў трэба дадаць этнацыд, які праводзіла АК супраць беларускай інтэлігенцыі. Немцы ж намінальна вынішчалі толькі тых, хто супрацоўнічаў з партызанамі. Уступкі Готберга Беларускай Цэнтральнай Радзе пасялілі ў беларусах надзею на тое, што ёсьць хоць нейкае выйсьце, ёсьць магчымасьць рэалізаваць свае нацыянальныя правы. Безумоўна, гэта былі ілюзіі, але гэта былі ілюзіі загнаных у кут. З аднаго боку - бальшавіцкая сьцяна, з другога - польская. Наперадзе - нямецкі плот з адной адзінай шчылінай: магчымасьць са зброяй у руках абараніць сябе і свае правы. Тыя, хто выбраў гэты шлях, у большасьці ўсьведамлялі марнасьць яго, але дзесьці ў глыбіні душы спадзяваліся на станоўчы вынік. Былі, безумоўна, і тыя, хто не спадзяваўся , але ішоў у БКА, каб даражэй прадаць сваю волю і жыцьцё.

Нельга сёньня адназначна сказаць і пра значэньне акцыі стварэньня БКА. Калі глядзець з вайсковага пункту гледжаньня, то эфект ад яе быў нулявы. Часткі БКА так і не ўступілі ў бой з бальшавікамі на фроньце, а іхні ўдзел у барацьбе з партызанамі быў непрацяглы і насіў эпізадычны характар. Беларусь страціла з-за мабілізацыі ў БКА каля 30 000 сьвядомых беларусаў. Большасьць жаўнераў і афіцэраў БКА або загінула, або засталася на Захадзе, або была вынішчана бальшавікамі.

З другога боку, мабілізацыя паказала, што ня ўсіх беларусаў можна атаясамліваць з цялятамі, якія пакорліва чакалі сталінскіх мясьнікоў. І тады, як і зараз, быў слой грамадзтва, для якога былі непрыймальнымі ні бальшавікі, ні палякі, ні немцы. Існавала толькі Беларусь, як мара, як ідэя. І трагедыя гэтых людзей перш за ўсё ў тым, што маючы недастаткова ўласнай сілы, яны мусілі паслугоўвацца чужой, на гэты раз нямецкай.

БКА прайграла. Прайграла на самым пачатку.

Ці выйграла Беларусь? Яшчэ не.

Сёньня мы зноў у куце. Сёньня зноў антыбеларуска-камуністычныя жорны перамолваюць беларусаў. Але сёньня на Беларусі зноў ёсьць слой грамадзтва, які гатовы паўстаць за Беларусь. Сёньня за нацыянальныя сілы галасуе мільён беларусаў. Насельніцтва Чачні менш мільёна, і яны пасьпяхова супрацьстаяць велізарнай Расеі. Значыць ёсьць шанец выстаяць і нам. І мы выстаім.

Станіслаў СУДНІК.

© PDF: Kamunikat.org 2013 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

ПАЛІТЫЧНАЯ СЦЭНА

ЗАПАЛІЎШЫ СЬВЕЧКУ, НЕЛЬГА ХАВАЦЬ ЯЕ ПАД СТОЛ

Гарадзкая арганізацыя БНФ «Адраджэньне» у нядзелю правяла справаздачна-выбарны сход. Канферэнцыя акрэсьліла сутнасьць палітычнага становішча і вызначыла накірункі далейшай дзейнасьці. У якасьці гасьцей прысутнічалі прадстаўнікі АГП, БСДГ і ПНЗ.

Выступ на канферэнцыі меў Зянон Пазьняк. Лідар руху ў сваёй прамове зрабіў шмат спасылак на гістарычны вопыт. У прыватнасьці, ён параўнаў цяперашні стан рэчаў з часамі расейскай імперыі 1905 году. Зянон Пазьняк зазначыў, што пасьля ганебнага леташняга рэферэндуму, значная частка грамадзянаў-патрыетаў апынулася у стане прастрацыі і разгубленасьці. Між тым, шлях праўды заўжды быў цярністым. Наіўна было б разьлічваць у сёньняшніх варунках, калі ўзяты курс таталітарнага выкараненьня нацыянальных каштоўнасьцяў, на хуткую зьмену палітычнай улады. Наканаванасьць БНФ - паўсядзённая карпатлівая праца, скіраваная на асьветніцтва.

Старшынём Гарадзенскай гарадзкой арганізацыі БНФ на трэці тэрмін абраны Кастусь Жынь.

Ладзік МАЙНІЧ.

КАБ ТЫЯ КАМІСІІ ДЫ Ў ПЛУГ

У лідзкім раёне ізноў працуе камісія Адміністрацыі прэзідэнта. Яна дасьледуе арганізацыю вытворчасьці мясной і малочнай прадукцыі ў раёне, правярае дакладнасьць налічэньня прыват, аналізуе стан бухгалтарскага ўліку. На падворку сярэдзіна лютага, а гэта ўжо пятая камісія за гэты год. Каб кожная з камісій хоць па возу сена ў калгасы падкінула, то, пэўна, карысьці было б болей. А так гэты правяральны сьверб больш нагадвае праверку білетаў на самалёце, на якім пад час палёту адказалі усе рухавікі.

Вацлаў СЯРПІНСКІ.

КАНСТЫТУЦЫЙНЫ СУД ЗРАБІЎ ПАСЛАНЬНЕ. ШТО ДАЛЕЙ?

Чарговае пасланьне Канстытуцыйнага Суду Рэспублікі Беларусь «Аб стане канстытуцыйнай законнасьці ў Рэспубліцы Беларусь у 1995 годзе» вельмі грунтоўна адрозьніваецца ад тых шумных кампаніяў, сьведкамі якіх мы былі ў годзе 1995-м . Між тым, значэньне гэтага пасланьня, без перабольшваньня можна сказаць, гістарычнае. І ня толькі ў тым сэньсе, што напісанае пяром ня вырубіць сякерай, хаця такая яго роля ў сёньняшняй сітуацыі няпэўнасьці і ўмаўчаньня таксама вельмі вялікая з пункту гледжаньня высьвятленьня гістарычнай праўды. Галоўнае значэньне пасланьня ў тым, што яно зьявілася ў адпаведны момант і ў адпаведным выглядзе, што дае падставы характарызаваць яго як вызначаючае рубеж.

Нарэшце ў палітыку і практыку дзяржаўнай дзейнасьці вярнулася салідарнасьць і прыстойнасьць. Наслухаўшыся завіральных ідэяў, бязглуздых абвінавачваньняў і гэткіх самых бязглуздых тлумачэньняў, зманлівых абяцанак, так прыемна чытаць лаканічныя радкі пасланьня, у якім выверана кожнае слова і кожная думка. Канешне, чытаньне такіх рэчаў патрабуе падрыхтоўкі, удумлівасьці. Затое суцяшае тое, што засталіся яшчэ ў краіне людзі, якія могуць выказаць бяз сораму за наступствы свае думкі.

Што вынікае з пасланьня? Паглыбляецца агульны крызіс у грамадзтве, у тым ліку ў такіх жыцьцёва важных галінах, як працоўныя правы, маёмасныя дачыненьні, палітычныя свабоды. Зрэшты, гэта і так вядома, але КС - першы і адзіны з дзяржаўных ворганаў, хто гэтага не хавае, а абвяшчае ў першых сказах свайго пасланьня. Пакуль справы ў краіне развальваюцца адна за другой, вышэйшыя дзяржаўныя структуры кусаюць адно другога: прызнаны неканстытуцыйнымі 5 нарматыўных актаў Вярхоўнага Савету і 11 - прэзідэнта. У якой паважаючай сябе дзяржаве можа такое быць? У нашай жа - можа, і ўсе маюць справу, уключаючы юрыстаў абодвух бакоў. Бюджэт крамсаюць, як хочуць, КС гэта адназначна засьведчыў - і што? Нічога. Законы падзялілі на добрыя і кепскія. Таксама нічога. Прэзідэнт перавысіў свае паўнамоцтвы ды яшчэ загадаў не прызнаваць рашэньні КС. Куды глядзіць пракурор, чаму не ўзбуджае справу на падставе артыкула 167 Крымінальнага Кодэксу? Дарэчы, і пракурора няма, а ёсьць «выконваючы абавязкі». Міжнародныя дамоўленасьці не выконваюцца, прычым, самыя грунтоўныя, якія датычаць працоўных правоў і правоў аб'ядноўвацца ў прафесійныя саюзы. А каб ніхто ня бачыў, што робіцца ў гэтай асобна ўзятай еўрапейскай краіне, усе сродкі масавай інфармацыі, паліграфічная база і сетка распаўсюджаньня зманапалізаваны. А каб маўчалі тыя, хто яшчэ ня страціў рэшткі сумленьня, на іх ціснуць і абвяшчаюць дэстабілізуючымі сіламі.

Вельмі сумная карціна выплывае пасьля азнаямленьня з пасланьнем Канстытуцыйнага Суду. Аднак у рэальным жыцьці яшчэ горш. Ці паўплывае пасланьне на стан грамадзтва? Так ці іначай, пасланьне - гэта рубеж. Уяўляецца, што пасьля яго справа законнасьці пойдзе ўгору. Думаць так аптымістычна дазваляе аналіз дзейнасьці ў мінулым годзе самога Канстытуцыйнага Суду і тых выпрабаваньняў, праз якія ён прайшоў.

Перш за ўсё ўражвае, як пісьменна Старшыня КС здолеў працягнуць час і стрымаць абарону пасьля зьбіцьця дэпутатаў апазіцыі і фактычнага спыненьня пасьля гэтага дзейнасьці Вярхоўнага Савету. Ня маючы ніякай афіцыйнай апоры, Старшыня здолеў скарыстаць былыя сувязі і пратрымаўся да восені, калі шэрагам паседжаньняўКС стварыў заканадаўчыя падставы імпічменту. Менавіта ўвосень наступіў пералом у стаўленьні наменклатуры старога скліканьня да палітыкі прэзідэнта. Наменклатура паставіла на выбары. Не апошнюю ролю ў зьмяненьні пазіцыі наменклатуры адыграў КС і яго старшыня.

Па-другое, няўжо гэта было зроблена выключна з адчаю? Не, вядома. Планы КС сягаюць дастаткова далёка. Цяпер суд мае магутную падтрымку з боку Вярхоўнага Савету і зьмяніўшай настрой наменклатуры, якая абыякава глядзіць на тое, як выганяюць з працы «вертыкальшчыкаў», але рабіць такое з сабой больш не дазволіць.

Па-трэцяе, як гэта ня дзіўна, будучыня законнасьці залежыць ад таго, наколькі наменклатура старога скліканьня здолее адстаяць свае правы, у тым ліку, пры дапамозе КС. Пры ўсёй абмежаванасьці сьветапогляду, старая наменклатура больш адпавядала і надалей адпавядае патрэбам кіраваньня грамадзтвам. З гэтым зьвязана і перамога наменклатуры на выбарах. Ахоўваючы сябе, наменклатура будзе падымаць планку законнасьці для ўсіх нас. Нездарма КС прапанаваў увесьці ў краіне пасаду ўпаўнаважанага па правах чалавека і прыняць закон аб адказнасьці за невыкананьне рашэньняў КС.

У гэтым сэньсе ня мае аніякага значэньня, у якой партыі састаяў Пан Ціхіня і якім шляхам патрапіў на пасаду старшыні КС. Значыць, так распарадзілася гісторыя. Ацэньваць трэба па справах і па нашых уласных інтарэсах. Справы ж Пана Ціхіні на пасадзе старшыні КС бездакорныя. Нашыя жінтарэсы патрабуюць дапамагаць КС і яго старшыні асабіста ўсімі магчымымі сродкамі.

Зрэшты, усе прагнозы сёньня вельмі хісткія. Як на самой справе павернецца жыцьцё - прадказаць цяжка. Аднак падзеі сёньня разгортваюцца вельмі жвава. Што ў адказ на пасланьне КС зробіць прэзідэнт? Ці змаўчыць? Пачакаем разам працягу тэмы.

Сяргей САМАСЕЙ.

ШТО ХАЦЕЎ СКАЗАЦЬ МЕЛЬНІКАЎ

У канцы кастрычніка, калі прапаноўваемы Вашай увазе артыкул (не адбыўшыйся выступ) трапіў у рэдакцыю, мы ўстрымаліся ад яго публікацыі. Надта скандальнай была сітуацыя, калі амаатары павучаць аказаліся няздольнымі слухаць свайго калегу, які мае іншую пазіцыю. Думалася, жыцьцё само расставіць акцэнты, дапаможа ветэранам разабрацца: дзе права, дзе лева. Аднак...

Апошнім часам пачалі ствараць грамадзкія камітэты ў падтрымку Лукашэнкі, які нагла і беспардонна іх жа і падмануў. Гатовыя ў любы момант прыйсьці да выбарчых урнаў, каб у чарговы раз прагаласаваць супраць «праклятых нацыяналістаў». А калі спатрэбіцца, дык і «рот могуць заткнуць» свайму апаненту. Так, як гэта здарылася 26 кастрычніка мінулага году на сходзе ветэранаў войн і партызанскага руху, які праходзіў у гарадзенскім Доме афіцэраў. Калі напрыканцы сходу да трыбуны падыйшоў старшыня дэмакратычнага аб'яднаньня ветэранаў Мікалай Мельнікаў, мікрафон быў адключаны. Выкрыкваючы абразы, па каманьдзе вядучага пасівелыя людзі сталі пакідаць залу...

«Мэр нашага горада Г.Крупенка ў сваім сёньняшнім выступе, аддаўшы належнае ветэранам, вышэй за ўсё аценіў уласьцівую ім «напорыстасьць». У гэтым ветэранам не адмовіш. Дзякуючы «напорыстасьці», ветэраны адстаялі ў поўным аб'ёме зароблену імі потам і крывёю пенсію. Але, як справядліва зазначыў ветэран вайны і труда Л.Закурдаеў у артыкуле «Требуем к себе уважения, а уважаем ли других?» («Гродзенская праўда», 10.10.95 г.), мы «в своих притязаниях к обществу и даже к родным», у патрабаваньнях матэрыяльных благаў, пашаны, і ад сябе дабаўлю, у нецярпімасьці да іншадумства, у імкненьні навязаць іншым людзям свае ацэнкі і ўяўленьні, «докучая всем», губляем павагу да сябе з боку падрастаючага пакаленьня.

Адстойваючы свае правы, мы можам праявіць раўнадушша, а часам і бессардэчнасьць да тых, хто побач, хто патрабуе нашай падтрымкі. Калі 30 верасьня гэтага году звольненыя ў запас афіцэры Узброеных сілаў вырашылі выступіць у клубе ветэранаў і паскардзіцца на свой нялёгкі лёс, іх груба адштурхнулі ад мікрафону. Ня толькі мне было больна і сорамна за прыніжэньне маладых афіцэраў запасу. Але кіраўнікі клуба не прынесьлі ім нават прабачэньня.

Пасівеўшыя людзі, якія сабраліся ў клубе ветэранаў, нярэдка, упадаючы ў эйфарыю, распальваючыся гневам з той ці іншай прычыны, зьневажаюць адзін аднаго. Выступы, пісьмы, запіскі, выкрыкі насычаны пагрозамі, непрыстойнымі словамі. Прывяду толькі адно выказваньне з ліста: «Четыре «Да» на референдуме - это первый осиновый кол в БНФ-овскую политику предателей народа Беларуси... Займитесь трудом, пока не поддал народ под задницу так называемому «народному» фронту...»

Ідзе наступ на беларускую мову. У большасьці школаў гораду, класы, у якіх у мінулым годзе выкладаньне вялося на роднай мове, пераводзяцца на расейскую. Гэтая акцыя суправаджаецца зьдзекам над беларускай мовай, пагрозамі ў адрас тых, хто хоча ня даць загінуць роднаму слову.

Улады з небывалай сілай кінуліся на незалежныя сродкі масавай інфармацыі. «Белорусская деловая газета», «Народная воля», штотыднёвік «Мы» выгнаны з друкарняў. «Белсаюздрук» адмовіўся распаўсюджваць апальныя выданьні. Тысячы грамадзян краіны засталіся без газет.

Але ні на адной з сустрэч у гарадзенскім Доме афіцэраў ветэраны не выказалі занепакоенасьці за лёс мовы карэннага насельніцтва, зямлі, на якой яны жывуць. Не прагучаў іх голас пратэсту супраць ганеньня на прагрэсіўную прэсу.

«Мы дали бой БНФ!» - з пафасам заявіў сёньня І.Амбросімаў. Паважаныя былыя воіны, гэта нікому не патрэбны бой. І вядзецца ён з парушэньнем маралі і закону. І задуманы ў палітычных мэтах.

У абвешчанае І.Амбросімавым змаганьне з БНФ вас імкнуцца ўцягнуць кіраўнікі ветэранскай арганізацыі, і некаторыя з вас, адгукнуўшыся на іх заклік і ўзяўшы за зброю нянавісьць, пайшлі бяздумна ў атаку на Беларускі Народны Фронт, які выступае за суверэнітэт нашай краіны, за адраджэньне яе эканомікі, культуры і гісторыі, за права беларусаў «людзьмі звацца»...»

АДКРЫТЫ ЛІСТ ДА ДЭПУТАТАЎ ВЯРХОЎНАГА САВЕТУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ АБ КАНСТЫТУЦЫЙНАЙ ЗАКОННАСЬЦІ

Паважаныя спадары дэпутаты!

Наша арганізацыя не палітычная, а грамадзкая: дабрачынная, праваабарончая і гісторыка-асьветніцкая. Яна яднае пацярпелых ад палітычных рэпрэсій у СССР, а пасьля рэабілітаваных, тых нямногіх былых вязьняў сталінскага ГУЛАГа, якія засталіся жывыя; удоваў і дзяцей расстраляных, замучаных у турмах і загінуўшых бязьвінных ахвяр таталітарнага рэжыму; а таксама высланых цэлымі сем'ямі за межы Беларусі, «раскулачаных», «уклонявшихся от налогов и повинностей» сялян; «членов семей врагов народа». Нашы сябры галасуюць на выбарах як за беспартыйных кандыдатаў, так і за прадстаўнікоў розных палітычных партый, акрамя камуністаў і так званых ліберал-дэмакратаў. Таму наш зварот трэба разглядаць як праваабарончы, а не палітычны.

Мы лічым сваім грамадзянскім абавязкам адгукнуцца на апублікаванае нядаўна «Пасланьне Канстытуцыйнага Суду Рэспублікі Беларусь аб стане канстытуцыйнай законнасьці ў 1995 годзе», і на некаторыя апошнія заявы прэзідэнта Лукашэнкі. Гавораць, што кепскаму танцору нагавіцы перашкаджаюць. Прэзідэнту Лукашэнку перашкаджае многае і многія. Апошнім часам асабліва Канстытуцыйны Суд і нават сама Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь. І гэта вельмі непакоіць, шлях да прававой дзяржавы ідзе праз павышэньне ролі і аўтарытэту судовай улады. Любыя супрацьлеглыя дзеяньні, спробы ўрэзаць гэту ўладу, вядуць у адваротным кірунку - да паліцэйскай дзяржавы. Гэта вядома з гісторыі, у прыватнасьці, з гісторыі СССР. А мы паспыталі дзяржаўны тэрор, беззаконьне на ўласнай скуры. Ніколі нідзе ні адзін чалавек ці група людзей ня можа быць гарантам законнасьці і правапарадку, ім можа быць толькі сістэма разьдзелу ўладаў, замацаваная ў нашай Канстытуцыі. З гэтага пункту гледжаньня інстытут Канстытуцыйнага Суду зьяўляецца абавязковым і неабходным, у адрозьненьне ад інстытуту прэзідэнцтва, які можа быць ці ня быць, і не зьяўляецца ні абавязковым, ні неабходным.

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь 13-га скліканьня пакуль яшчэ ніяк не адрэагаваў на адміністрацыйнае ігнараваньне прэзідэнтам Лукашэнкам азначэньняў Канстытуцыйнага Суду ад незаконнасьці многіх яго ўказаў. А таксама некаторых законаў, прынятых Вярхоўным Саветам 12-га скліканьня. Між тым, гэтыя азначэньні, паводле Закону, зьяўляюцца канчатковымі і не належаць абскарджаньню і апратэставаньню, уступаюць у моц з моманту іх прыняцьця.

Мы заклікаем усе фракцыі і незалежных дэпутатаў Вярхоўнага Савету з усёй сур'ёзнасьцю і адказнасьцю аднесьціся да склаўшайся ў рэспубліцы небясьпечнай сітуацыі, калі сам прэзідэнт першы парушае Канстытуцыю і законы, выказвае поўную непавагу да суду, што зьяўляецца дастатковай падставай для працэдуры ўзбуджэньня імпічменту. Мы заклікаем вас не дапусьціць ушчамленьня правоў і паўнамоцтваў Канстытуцыйнага Суду, а тым больш, яго скасаваньня; не дапусьціць на рэферэндум рашэньне гэтых няпростых прававых праблемаў дзяржаўнага ладу, які патрабуе сьпецыяльных ведаў. Мы заклікаем вас дакладна вывучыць, уважліва і бесстаронна разгледзець прапановы Канстытуцыйнага Суду аб унясеньні зьменаў у Канстытуцыю Беларусі і Закон аб Канстытуцыйным Судзе ў частцы пашырэньня яго паўнамоцтваў, у прыватнасьці, наданьня яму права афіцыйнага тлумачэньня Канстытуцыі. Гэта будзе важны крок на шляху пабудовы ў Беларусі прававой дзяржавы.

А надалей нам варта імкнуцца да ўступленьня Беларусі ў Савет Эўропы і прызнаньня ёю юрысдыкцыі Эўрапейскага Суду па правах чалавека.

П.ЖУК,
старшыня гарадзенскай асацыяцыі ахвяр палітычных рэпрэсій;
А.ФІРСАЎ,
адказны сакратар.

ПРАФЕСАРЫ І ДАЦЭНТЫ - ЗА БЕЛАРУСКУЮ МОВУ

Як паведамляла «ПАГОНЯ», у канцы студзеня гарадзенскім Таварыствам беларускай вышэйшай школы быў распачаты збор подпісаў пад зваротамі да старшыні Вярхоўнага Савету Беларусі С.Шарэцкага, міністра адукацыі В.Стражава, старшыні Гарадзенскага аблвыканкаму А.Дубко. Нягледзячы на тое, што збор подпісаў прыйшоўся на перыяд зімовых канікул, пад зваротамі падпісаліся 73 выкладчыкі ўсіх ВНУ Горадні. Большасьць з іх - прафесары і дацэнты, дактары і кандыдаты навук.

Навукоўцы прапануюць паскорыць беларусізацыю вышэйшай адукацыі ў сувязі з тым, што праз пяць гадоў большасьць школьнікаў (у прыватнасьці, на Гарадзеншчыне) закончаць беларускія школы, а працягнуць адукацыю на роднай мове ня будуць мець магчымасьці. Міністру адукацыі прапаноўваецца аддаць загад, каб ужо ў гэтым годзе ва ўсіх ВНУ Беларусі абітурыенты здавалі ўступныя экзамены абавязкова (а не па выбару) і па беларускай, і па рускай мовах.

Звароты перададзены адрасатам.

Ул. інф

© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

!!! ВЯЛІКІ КРЫМІНАЛ

Карупцыя – найбольш характэрная зьява для краін трэцяга сьвету - там, дзе існуе зьмешаная эканоміка і вельмі вялікая ўлада ў бюракратыі, якая непасрэдна ўплывае на эканоміку. Па такім шляху ідзе зараз Рэспубліка Беларусь (дакладней, па гэтым шляху яе вядуць). Таму карупцыя ёсьць сутнасная зьява ў цяперашняй Беларусі. Яна будзе большаць і паглыбляцца, закранаць нацыянальныя інтарэсы - усе жыцьцёва важныя сьферы існаваньня краіны. Маштабы яе могуць стаць такімі грандыёзнымі, а вынікі такімі разбуральнымі, што пакараньне за яе страціць усялякі сэнс. Вось тады грамадзтву (нармальнаму грамадзтву) становіцца зразумелым, што змагацца супраць карупцыі трэба ўсімі метадамі, але найперш стварэньнем такога дзяржаўнага і эканамічнага парадку, які ў прынцыпе, у сутнасьці сваёй не спрыяе карупцыі.

Тое, што А.Лукашэнка насуперак нацыянальным інтарэсам Беларусі падпісаў вар'яцкія пагадненьні з Ельцыным і Чарнамырдзіным і здаў Расеі наш транзіт, мытную справу і нафтахімічны комплекс - не знаходзіць ніякага разумнага палітычнага, эканамічнага і ўвогуле лагічнага тлумачэньня. Беларусі нанесеныя каласальныя страты. Адзін транзіт каштаваў нам каля трох мільярдаў долараў страты за год (гэта гадавы бюджэт Беларусі). Я ўжо не кажу пра нафтахімічны комплекс, здача якога - гэта катастрофа для нашай краіны, рабаўніцтва маёмасьці дзяржавы сярод белага дня. Безумоўна, гэта крымінал. Але крымінал улады. Таму грамадзтва, прывучанае падпарадкоўвацца ўладзе і чакаць, што ўлада для яго ўсё зробіць - маўчыць.

Як часам дзейнічае выканаўчая ўлада, праілюструю на прыкладзе аднаго (аднаго з многіх) сакрэтнага распараджэньня прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Лукашэнкі N 230-оп ад 22 лістапада 1995 г. «О налоговых льготах государственному торгово-экспозиционному предприятию «Торгэкспо». Сутнасьць гэтага распараджэньня ў тым, што па волі А.Лукашэнкі з «Торгэкспо» здымаюцца ўсе мытныя пошліны, акцызы, падаткі на дабаўленую вартасьць, на ўвозімыя тавары згодна кантрактаў «согласованных с Управлением делами Президента Республики Беларусь». Сродкі, захаваныя такім чынам ад няўплаты падаткаў і невыплачаныя ў бюджэт, накіроўваліся ў «сьпецыяльны фонд» прэзідэнта А.Лукашэнкі. Што гэта за фонд, па якому праву ён створаны, дзе зарэгістраваны, дзе яго рахункі, што за сродкі ідуць у гэты фонд, якім чынам і адкуль, на што расходуюцца гэтыя сродкі, хто акрамя А.Лукашэнкі імі карыстаецца і распараджаецца і г.д. - усё гэта пакрыта змрокам таямніцы. Пра гэты фонд амаль ніхто ня ведае і ніхто яго не кантралюе.

Тым часам чытаем далей сакрэтныя дакуманты «не для печати». Вось кантракт N 01-11/95 ад 23 лістапада 1995 г. (зьвярніце ўвагу на даты), заключаны прадпрыемствам «Торгэкспо» і нейкай фірмай «Union Distribution Limited», разьмешчанай у Хельсінкі. Сутнасьць кантракту ў тым, што менскае «Торгэкспо» па даручэньні хельсінкскага «Union Distribution Limited» і за яго кошт «заключает от своего имени договоры купли-продажи товара в соответствии со спецификацией N 1» (прыкладаецца). У сьпецыфікацыі пазначана 50 назваў тавараў «народнага спажываньня». (17 назваў, дарэчы, ня маюць дачыненьня да «тавараў народнага спажываньня»).



КОНТРАКТ № 01-11/95г.

г. Минск — 23 ноября 1995 г.

Фирма "UNION DISTRIBUTION LIMITED" именуемая в дальнейшем "ПРОДАВЕЦ" с одной стороны, и Государственное торгово-экспозиционное предприятие "ТОРГЭКСПО", именуемое в дальнейшем "ПОКУПАТЕЛЬ", с другой стороны, заключили настоящий контракт о нижеследующем:

1. Предмет контракта

1.1. Покупатель по поручению Продавца и за его счет заключает от своего имени договоры купли-продажи товара в соответствии со спецификацией №1, являющейся неотъемлемой частью настоящего Контракта.
На каждую конкретную партию товара составляется дополнительная спецификация с указанием цен, объемов и сроков поставки товаров.
Дополнительные спецификации являются неотъемлемой частью настоящего Контракта.

2. Цена и общая стоимость контракта

2.1. Цены на товар, указанные в спецификациях, являются неотъемлемой частью настоящего контракта, устанавливаются в долларах США и понимаются DDU Минск, включая стоимость упаковки и маркировки товара.
2.2. Общая сумма настоящего контракта составляет 500 000 000 (пятьсот миллионов) долларов США

Распоряжение
Президента Республики Беларусь
Не для печати
22 ноября 1995 г. № 230рп — г. Минск

О налоговых льготах государственному торгово-экспозиционному предприятию "Торгэкспо"

1. В целях обеспечения населения Республики Беларусь товарами народного потребления в канун Нового года освободить государственное торгово-экспозиционное предприятие "Торгэкспо" от уплаты таможенных пошлин, акцизов, налога на добавленную стоимость по продовольственным и промышленным товарам народного потребления, ввозимым в Республику Беларусь на основании контрактов, согласованных с Управлением делами Президента Республики Беларусь.
2. Направить средства, сохраненные "Торгэкспо" в соответствии с пунктом 1 настоящего распоряжения, в специальный фонд Президента Республики Беларусь.
3. Контроль за выполнением настоящего распоряжения возложить на Управление делами Президента Республики Беларусь, Министерство финансов и Государственный таможенный комитет.

Президент Республики Беларусь — А.Лукашенко

Агульная сума кантракту складае 500.000.000 (пяцьсот мільёнаў) долараў ЗША.

Кантракт падпісаны двума бакамі. Ёсьць адрасы. Стаяць пячаткі. А з беларускага боку яшчэ і пячатка «Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь».

А цяпер нескладаныя разьлікі - колькі «хапнулі» ў дзяржавы па адным толькі гэтым кантракце. Мытная пошліна ад кошту закупленага тавару складае 75 млн.USD, падатак на дабаўленую вартасьць - 115 млн.USD, потым акцызы, транспартныя кошты і інш. - усяго разам атрымліваецца 320 (трыста дваццаць) мільёнаў долараў ЗША.

Бюджэт Беларусі не далічыўся гэтых мільёнаў. Шмат гэта ці ня шмат? Гэта вельмі шмат. Гэтая сума перавышае на 30 працэнтаў сродкі, выдаткаваныя ў дзяржаўным бюджэце 1995 г. на навуку, культуру, адукацыю і ахову здароўя разам. (Напрыклад, на адукацыю, культуру і ахову здароўя ў бюджэце выдзелена 148 (сто сорак восем) мільёнаў долараў). Бедная культура, бедныя паліклінікі і бальніцы, куды савецкі пеньсіянер ідзе са сваімі лекамі; зьвягаючы, што «не памагают прэзідэнту», і бедная навука, ад якой крымінальная «імперыя Ціцянкова» (правая рука А.Лукашэнкі) скора адбярэ ўсе памяшканьні. (Дарэчы, што там Кебіч са сваімі трымя мільёнамі, выдадзенымі для жонкі. Такія маштабы яму пэўна і ня сьніліся).

Каментарыяў да ўсяго гэтага даваць ня буду. І так усё зразумела. А што не зразумела, трэба спадзявацца, некалі высьветліць пракуратура, суд, камісія Вярхоўнага Савету, Кантрольная палата і г.д. Усе яны ведаюць пра гэтыя дакуманты і зьдзелкі.

Магчыма нешта высьветліць для сябе і нашае грамадзтва, хаця, калі шчыра, я ў гэтым сумняваюся. Яно па звычцы застанецца абыякавым да сябе. А шкада, бо толькі ад яго цяпер залежыць спыненьне крымінальнага стану ўлады ў нашай краіне.

Зянон ПАЗЬНЯК.

КРАМЫ «ПАЙШЛІ З МАЛАТКА»

Чатырнаццатага лютага ў Наваградку прайшоў трэці аўкцыён па продажу камунальнай уласнасьці, арганізаваны аддзелам па кіраваньню эканомікай і рынкавымі адносінамі Наваградзкага гарвыканкаму пры садзеяньні Міжнароднай фінансавай карпарацыі.

У выніку аўкцыёну ў прыватныя рукі перайшлі два аб'екты. Крама N32 у гістарычнай частцы была купленая за 195 мільёнаў, а крама на вуліцы Гарадзенскай у цэнтры Наваградку «пайшла з малатка» за 96 мільёнаў.

Увесь прыбытак ад аўкцыёну - больш 290 мільёнаў рублёў – пайшоў у гарадзкі бюджэт.

Ул. інф.

ПАСЕДЖАНЬНЕ СТРАЙКАВАГА КАМІТЭТУ

16 лютага ў сярэдняй школе N 3 г.Ліды адбылося паседжаньне страйкавага камітэту настаўнікаў лідзкіх школаў. Паседжаньне выклікана затрымкай выплаты зарплаты і спробай уводу так званага «графіку выплаты заработнай платы».

Калі раней усім настаўнікам горада зарплата выдавалася ў адзін дзень, то зараз адміністрацыя прапануе прызначыць кожнай школе свой дзень. Настаўнікі лічаць гэта тактычным крокам, накіраваным на тое, каб раз'яднаць педагогаў горада, падарваць іх адзінства, і яны патрабуюць старога парадку выдачы зарплаты.

Страйкам падрыхтаваў ліст на адрас Вярхоўнага Савету і гарвыканкаму, у якім выказваецца рашучасьць у выпадку невыкананьня сваіх патрабаваньняў пайсьці на акцыі пратэсту. Час і форма акцый будуць абмяркоўвацца дадаткова.

ЧАРКА- СІМВАЛ РЫНКАВАГА САЦЫЯЛІЗМУ

Быў час, калі нёманскае шкло ішло нарасхват ў выглядзе «зуброў», «кошыкаў», «рагоў», іншых цудоўных мастацкіх вырабаў. Але мяняюцца часы, мяняецца попыт. Зараз 60% у агульным аб'ёме вытворчасьці Бярозаўскага шклозавода «Нёман» складаюць чаркі.

Зьміцер СЬВІСТУНОВІЧ.

ШТО ДАЗВОЛЕНА ЮПІЦЕРУ...

У трэцім нумары «ПАГОНІ» за 1996 год мы паведамлялі пра тое бядотнае становішча, у якім апынулася большасьць пеньсіянераў.

З часу той публікацыі прайшоў месяц, падвысілася мінімальная зарплата. Ці зьмянілася сітуацыя?

На жаль, не. І ўпэўніваюць нас у гэтым лісты нашых чытачоў, многія з якіх даведзеныя ад нястачы да жабрацкага стану, безвынікова абіваюць парогі розных сабесаў, саветаў і нават пракуратур. Адзінае, чаго ўдаецца дасягнуць гэтым хаджэньнем па кабінетах – мізерную дабаўку. Прычым, далёка не заўжды.

Яскравы прыклад - адказ аблсабесу пеньсіянэркі Мар'яне Побаль з Грандзічаў. Прапрацаваўшы на дзяржаву больш двух дзесяткаў гадоў, яна атрымлівала грошай амаль столькі ж, колькі тыя, хто не працаваў ніводнага дня.

«На вашыя заявы паведамляем, што памер Вашай пеньсіі вылічаўся пры стажы працы 23 гады, 11 месяцаў, 25 дзён, зыходзячы з індывідуальнага каэфіцыенту 0,51413 (методыку вылічэньня гэтай лічбы мы давалі ў N 3 «ПАГОНІ» - аўт.) і ў студзені склаў 257 тысячаў. Пры праверцы пеньсійнай справы ўстаноўлена, што Ваш стаж складае 24 гады і 5 дзён. Памер пеньсіі будзе пералічаны з улікам гэтага стажу.

Вашаму мужу пеньсія налічана пры стажы 28 гадоў, 6 месяцаў, 5 дзён, зыходзячы з каэфіцыенту 0,35864 і ў студзені склала 234 тысячы».

Пералічылі. З улікам падвышэньня «мінімалкі» атрымалася трыста тысячаў. Хоціць, бабуля, каб кожны дзень на працягу месяца купляць па булцы хлеба, бутэльцы малака ды пляшцы мінеральнай, каб страўнік не балеў ад пераяданьня. Жанчына зноў зьбіраецца па інстанцыях за праўдай. Але ніводзін чыноўнік ня здолее ёй растлумачыць, што больш прыходзіць марна, што больш грошай «не положено по закону». Бабуля прыходзіць за праўдай, а ёй у адказ - пра законы. У большасьці выпадкаў у нашай краіне гэтыя два паняцьці знаходзяцца на супрацьлеглых палюсах.

Яскравы гэтаму прыклад - сумнавядомы указ прэзідэнта аб ліквідацыі ільготаў. Так, у краіне ледзь ня кожны другі - ільготнік. Так, мноства з гэтых ільготнікаў атрымала ільготы падманным шляхам. Так, для дзяржавы кожная ільгота - страта ў бюджэце. Але ж нельга абабраць абкрадзенага! Для мільёнаў ветэранаў розныя палёгкі (на квіткі ў транспарце, на аплату тэлефона, камунальных паслуг, лекі і г.д.) хоць у нейкай ступені кампенсавалі скрадзеныя дзяржавай грошы за доўгія гады працы.

«Чарговы раз пішу ва ўсе інстанцыі аб зьдзеках над працуючымі пеньсіянерамі, ветэранамі арміі і флоту, без усялякіх падстаў пазбаўленымі ў кастрычніку 1995 году пеньсіі на 50%. Аб зьдзеках над непрацуючымі пеньсіянерамі, ветэранамі сацыялістычнага будаўніцтва, якія атрымліваюць нізкія пеньсіі», - піша ў «ПАГОНЮ» Георгій Маскаўчук з Слоніма.

Чацьвёрты месяц чалавек праз суд спрабуе даказаць сваё законнае права на адпаведную кампенсацыю за гады, аддадзеныя працы. Чацьвёрты месяц чыноўнікі прыкрываюцца законамі ды ўказамі, робячы ў рэшце рэшт дурнем самога чалавека. Маўляў, не разумееш палітыкі ўраду - не ўздымай шуму, не баламуць людзей. Зьверху лепш відаць. Што дазволена Юпіцеру, тое не дазволена быку.

Юпіцеру ў нашым выпадку дазволена думаць, а быку - есьці траву. У колькасьці, вызначанай Юпіцерам.

Трава сканчаецца, спадары Юпіцеры.

Вітаўт РУДНІК.

НАМ БЫ ДЗЕНЬ ПРАТРЫМАЦЦА, ДЫ НОЧ ПРАСТАЯЦЬ!

Крыніцаю лічбаў, якія я прапаную ніжэй увазе чытачоў, зьяўляецца часопіс «Wall Street Journal», Central European Economic Revue.Там прыведзеныя базавыя эканамічныя зьвесткі за 1992-1994 г.г. Яны яскрава сьведчаць аб характары расейскай эканамічнай палітыкі ў дачыненьні да Беларусі і стратэгіі прэзідэнта Беларусі ў сьвеце гэтай палітыкі. Аналізуючы іх, можна зразумець, чаму наша Міністэрства аналізу і статыстыкі не падае зьвестак у вартасным выражэньні, эквівалентным долару, хоць гэтыя зьвесткі былі ім атрыманыя ад Міжнароднага валютнага фонду, Міжнароднага банку, Эўрапейскага банку рэканструкцыі і разьвіцьця.

У 1992 г. валавы унутраны прадукт (ВУП) Рэспублікі Беларусь у доларавым эквіваленьце склаў 22616 млн.долараў, або $2171 на кожнага чалавека. Нагадаю, што валавы ўнутраны прадукт мае тры крыніцы фармаваньня: вытворчасьць тавараў і паслуг нацыянальнай эканомікі, чысты імпарт і падаткі. У 1993 г. ВУП скараціўся на 11,7% і склаў $19170 млн. ($1939 на кожнага жыхара). Гэта 88,3% у стасунку да 1992 г. У 1994 г. падзеньне ВУП склала 19%. ВУП склаў $16176 млн. ($1570 на кожнага жыхара). У 1995 г. ВУП склаў $10100 млн., можа, на некалькі мільёнаў больш ці менш. Гэта значыць, што толькі за апошні год прэзідэнцкага кіраваньня ВУП скараціўся на трэць.

Калі прыняць 1992 г. за 100%, то ВУП складаў у 1993 - 88,3%, у 1994 - 71,5%, у 1995 - 44,7% ад 1992 году.

За апошнія тры гады (паўтара года Кебіча і паўтара Лукашэнкі) ВУП скараціўся больш чым напалову.

Як вядома, Лукашэнка падпісаў пагадненьне аб перадачы 74% маёмасьці Наваполацкага нафтаперапрацоўчага заводу расейскім уласьнікам. Гэта азначае, што сёньня Рэспубліка Беларусь ня можа ацяпляць кватэры сваіх грамадзян з уласных крыніцаў. Стратэгія прэзідэнта палягае на тым, каб плаціць за сацыяльны спакой стратэгічнай уласнасьцю нашай краіны.

І працэс продажу стратэгічна важных прадпрыемстваў адбываецца наступным чынам: залік «Газпрому» робяць зьвязаныя з Беларусьсю расейскія нафтавыя кампаніі, якія фінансуюцца кансорцыюмам расейскіх банкаў. Такім чынам, расейскія банкі перакідваюць грошы ў залік беларускага доўгу «Газпрому», і ў выніку нафтагазавы комплекс Беларусі пераходзіць ва ўласнасьць расейскіх банкаў, нафтавых кампаніяў і часткова «Газпрому». Гэта ёсьць сёньняшняя рэальная эканамічная стратэгія Расеі ў дачыненьні да Беларусі. Палітыка сёньня набывае формы, калі, будучы дэмакратычным, урад Беларусі ня зможа замахнуцца на права прыватнай уласнасьці, а нашая стратэгічная маёмасьць робіцца менавіта прыватнай уласнасьцю.

Другі момант. Сёньня эканоміка краіны не перажывае крызісу, як гэта было пры Кебічу. Сёньня эканоміка ўвайшла ў паласу распаду. Вы бачыце, што немагчымасьць падтрымліваць нацыянальную эканоміку ў рабочым стане (пра гэта гаворыць павелічэньне імпарту і палітыка ў гэтай сьферы) прыводзіць да новага разуменьня ўрадавай стратэгіі, распрацаванай прэзідэнцкімі структурамі. Яна палягае на тым, што ва ўмовах, калі магчымасьці нацыянальнай эканомікі вычарпаны і замежных інвестыцыяў не прадбачыцца, пастаўлена задача падтрымаць на пэўны перыяд часу курс долара шляхам здачы маёмасьці Рэспублікі Беларусь транснацыянальным карпарацыям за доўг ураду.

Такая стратэгія ўраду зьяўляецца самагубчай, і ён гэта добра ведае. Гэта стратэгія распрацаваная на перыяд у 6-7 месяцаў. Яе мэта - дачакацца прэзідэнцкіх выбараў у Расеі, пры гэтым нікога не цікавіць сітуацыя ў эканоміцы Беларусі. Усе намаганьні будуць пакладзеныя на недапушчэньне сацыяльнага выбуху і захаваньне ўлады любой цаной.

Анатоль СТАНКЕВІЧ.

ЧАРГА ЁСЬЦЬ - ЖЫЛЬЛЯ НЯМА

У чарзе на атрыманьне жыльля ў Горадні сёньня стаіць 27 тысячаў чалавек.

За мінулы год, як паведаміў «ПАГОНІ» загадчык кватэрнага аддзелу гарвыканкаму сп.Караваеў, кватэры атрымалі ўсяго 860 чалавек. Колькі людзей атрымае запаветныя ордэр і ключы сёлета - спрагназаваць немагчыма. Грошай на будаўніцтва жыльля ў гарадзкім бюджэце няма. Нават калі колькасьць выдзяляемых за год кватэр застанецца ў бліжэйшы час на ўзроўні мінулага году, то няцяжка падлічыць, што апошні чалавек у сьпісе 27-тысячнай чаргі атрымае кватэру толькі ў 2026 годзе.

Ул. інф.

© PDF: Kamunikat.org 2013

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

ЗЯМЛЯ КЕЛЬТАЎ

Пад крылом самалёта востраў Ірландыя набліжаецца вялізным смарагдам у аправе сівой пены і блакітных хваляў. Што ведаем мы, беларусы, пра гэтую краіну і яе народ? Амаль нічога, або набор банальных стэрэатыпаў. Большасьць упэўнена, што гэта тыя ж ангельцы, толькі правінцыйныя, тая ж мова, толькі ў вясковадыялектным варыяньце. Падобна на тое, як нас і нашую культуру бетонамяшалкай невуцтва зьмешваюць з усходнім матэрыялам.



Старажытнарымскі гісторык Тацыт паведамляе, як стоячы на беразе заваяванай Брытаніі і ўглядаючыся ў недалёкія скалы Гіберніі (так тады называўся востраў Ірландыя), рымскі палкаводзец Агрыпа самаўпэўнена казаў: «Каб скарыць гэтую краіну, дастаткова аднаго легіёну». Ня выйшла. Рымляне будавалі Ландзініум (пазнейшы Лондан), гаспадарылі ў цяні пірамідаў і ў зябкай Таўрыдзе (Крым), але старажытных ірландцаў не скарылі ніколі. Плямёны кельтаў, якія панавалі ў Эўропе ад Панноніі (Венгрыя) да Пірэнеяў, прыйшлі ў Гіберню ў I ст. да н.э. і ўспрынялі культуру, якая квітнела тут у неалітычны і бронзавы век.

У 432 г. н.э. місіянеры пачалі хрысьціянізацыю ірландзкіх плямёнаў (іраў або эйраў). Манахі з краіны кельтаў у раньняе сярэднявечча былі вядомыя сваёй вучонасьцю і асьветніцкай дзейнасьцю па ўсёй Эўропе, засноўвалі кляштары - цэнтры тагачаснай культуры - ня толькі ў Ірландыі, але і ў іншых краінах. Менавіта яны склалі мацнейшую апазіцыю рэформам у каталіцкай царкве, якія праводзіў папа Грыгоры Вялікі ў 7 ст. Так, кельты ўмелі супраціўляцца.

Каменныя манументальныя крыжы, упрыгожаныя мініяцюрамі рукапісныя кнігі, творы рытуальнага і аздобнага мастацтва, непаўторная архітэктура, гераічныя сагі - культура сярэднявечнай Ірландыі зьявілася адным з вышэйшых дасягненьняў чалавечага генія. Адмысловай адметнасьцю гэтых помнікаў ёсьць непараўнальная мелодыя арнаментаў - тысяч сьпіраляў і ліній, у якіх гучыць вечнасьць і бясконцасьць жыцьця.

У 8 ст. пачынаецца наступ на Ірландыю вікінгаў, спачатку дацкіх, потым нарвежскіх. Бясконцыя наезды па некалькі разоў вынішчалі квітнеючыя гарады і славутыя кляштары. Але ворагі ня здолелі падбіць усю тэрыторыю востраў, захапіць сталіцу Тару, сядзелі за мурамі крэпасьцяў. А ў 1014 г. кароль Брайен Бору пад Клантарфам разьбіў вікінгаў ушчэнт і зрабіў іх сваімі даньнікамі.

Наступны акт трагедыі пачаўся ў 1169 г., калі здраднікі прывялі за сабой гаспадароў Брытаніі нарманаў. Абаронцам Дубліна пасьля штурму заваёўнікі перабілі косьці і яшчэ жывых кінулі са скалаў на прыбярэжнае каменьне. Але кожны крок па ірландзкай зямлі акупляўся ім дарагой цаной. Летапісцы паведамляюць пра контрнаступы і вынішчэньне ірландцамі цэлых армій нарманаў. На стагоддзі непакорлівы востраў стаў спадчыннай хваробай ангельскіх каралёў. Ірландцы не прымаюць Рэфармацыю на пачатку 16 ст., і з таго часу нацыянальна-вызваленчы рух набывае і рэлігійны характар. Пасьля разбуральных карніцкіх выправаў часоў Эльжбеты I Англійскай сілы народу падарваныя. Гравюра ў хроніцы паказвае капітуляцыю паўстанцкіх князёў. Суровыя, барадатыя дзядзькі ўклончаныя перад фанабэрыстым каралеўскім вяльможам. Гэтая поза аказалася надта нязручнай для гордых іраў. Ужо праз пакаленьне ў 1595 г. успыхвае пераможнае паўстаньне пад кіраўніцтвам графа Хьюга О'Нэйла. Англічане разьбітыя ў Ольстэры, на падмогу паўстанцам ідзе іспанскі флот. Але праз 6 гадоў зноў параза, кіраўнікі паўстаньня з турмы адплываюць на выгнаньне. Гэта канец старой кельтскай Ірландыі. Такую катастрофу можна параўнаць з вайной 1654-67 г.г. на Беларусі.

Панаваньне ангельскага заканадаўства, засяленьне асаднікаў, перасьлед каталіцкай царквы, забарона каталікам займаць адміністрацыйныя пасады і насіць зброю - універсальныя метады нацыянальнага ўціску. У 1641 г. каталікам належала 59% зямлі, у 1695 - 14%, а ў 1714 - ужо 7%. Акупанты зачынялі каталіцкія цэрквы, кідалі ў турму і каралі сьмерцю сьвятароў і біскупаў. Народ зьбіраўся на імшу тайна, у полі або ля руін царквы. Ірландзкая (гэльская) мова губляла свае правы, актыўна выціскалася з дзяржадміністрацыі, асьветы. Размаўляць па-гельску было небясьпечна. Дарэчы, гельская мова разам з шатландзкай і валійскай жыла і жыве дагэтуль, як спадчына магутнай некалі кельтскай моўнай стыхіі. І ні на якую іншую мову не падобная. Аднак рэпрэсіі супраць нацыянальнай культуры і лінгвіцыд (вынішчэньне мовы) не праходзяць дарма. Зоркі першай вялічыні ірландзкай літаратуры Джонатан Свіфт, Оскар Уайльд і Бернард Шоў пісалі па-ангельску.

Але гэта не фінал. Супраць ірландцаў вялі жорсткія войны Карл I і ягоны зацяты вораг Кромвель. У 1690 г. у знакамітай бітве на рацэ Бойнэ пацярпела паразу каталіцкае войска. Гісторыкі нават ставяць пытаньне, ці не сфармаваліся ў Ірландыі дзьве нацыі - каталіцкая і пратэстанцкая. Паўстаньне 1798 г. нейкім чынам дае адказ - не. Здаралася, што каталікі забівалі каталікоў, а прычынай паўстаньня былі карніцкія экспедыцыі брытанскага войска. Ірландцы ваявалі пад нацыянальным сьцягам - залатая арфа на зялёным фоне. Ля магілы паўстанцаў музейны супрацоўнік успомніў Касьцюшку, той рэвалюцыйны ўздым, які ахапіў усю Эўропу. І яшчэ сказаў: «Яны змагаліся, ня маючы ніякай надзеі на перамогу». Другі ірландзец дадаў: «Як і паўстанцы 1916 году». На Вялікдзень у красавіку 1916 г. некалькі сотняў байцоў захапілі цэнтр Дубліна і абвясьцілі незалежную рэспубліку. Трымалі абарону некалькі дзён.

Адзіны з нерасстраляных брытанцамі кіраўнікоў паўстаньня Эман Дэ Валера стаў пазьней прэзідэнтам Ірландыі.

Я слухаў маіх спадарожнікаў і думаў, што ж гэта за народ, кожнае пакаленьне якога ўпарта выходзіла на рынг няроўнай барацьбы і змагалася нават безнадзейна?! У 19 ст. настаў новы этап нацыянальнага адраджэньня. На мітынгу ў 1843 г. у старажытнай сталіцы Тары сабраўся адзін мільён (!) чалавек. І новы разбуральны ўдар. Хвароба бульбы, асноўнай ежы насельніцтва, прывяла да страшнага голаду. Абрытанцы працягвалі вывозіць збожжа з востраў і не давалі ніякай дапамогі. Тады, у 1845-49 г.г. загінула 800 тысяч чалавек, 2 мільёны эміграваліў Амерыку. Ірландзкая баявая арганізацыя фейнаў пачынае сапраўдную вайну супраць каланіялістаў. Гэтыя адчайныя хлопцы былі прыкладам для бамбістаў-нарадавольцаў і эсэраў. Патрыётаў яднаў гімн:

Зноў станем нацыяй,
Нацыяй станем зноў,
Каб Ірландыя не была правінцыяй...

І толькі пасьля I Сусьветнай вайны, пасьля партызанцкай барацьбы 1919-20 г.г. і грамадзянскай вайны 1921 г. была заваявана незалежнасьць. Аднак 6 графстваў Ольстэра на поўначы востраў засталіся пад адміністрацыяй Вялікабрытаніі. Апошнія 25 год там працягвалася змаганьне за вызваленьне, якое вяла Ірландзкая Рэспубліканская Армія. Толькі нядаўна гэтая падпольная арганізацыя пайшла на мірныя перамовы з лонданскім урадам.

Цяпер Рэспубліка Ірландыя - заможная краіна. Высокаразьвітая сельская гаспадарка і турысцкая індустрыя прыносяць асноўныя прыбыткі дзяржаве і народу. Тысячы беларускіх дзяцей штогод адпачываюць у ірландзкіх сем'ях. Уражвае рацыянальная арганізаванасьць жыцьця і адначасна мірны, вясёлы нораў людзей. У кожным пабе-рэстаранчыку пачуеш фальклорную музыку (скрыпка. гармонік) і песьню: «Ня грошаў, ня працы, ну й не бяда...»

Вайскоўцаў я ўбачыў пару разоў толькі ў Дубліне. У краіне няма абавязковай службы. Зазірнуў у браму вайсковай часткі - па плацу нетаропка ехаў афіцэр на гоначным ровары... А пад гатычнымі скляпеньнямі сабора Сьв.Патрыка вісяць сьцягі гераічных ірландзкіх палкоў.

Te libertatem laudamus - Цябе, свабода, усхваляем!

Валеры БУЙВАЛ,
Дублін - Горадня.

НА ЗДЫМКУ: Дублінскі замак.

ІМ СЬНЯЦЦА СНЫ АБ БЕЛАРУСІ

«Неабходна ўзнавіць адзіную дзяржаву ў межах былога СССР», - такая думка старшыні Расейскага Агульнанароднага Саюзу (РАС) намесьніка старшыні Дзяржаўнай Думы Расеі Сяргея Бабурына. Ён выказаў яе 20 лютага на сваёй прэс-канферэнцыі ў Дзяржаўдуме. Паводле Бабурына, варта ня толькі клапаціцца пра ўзнаўленьне дзяржаўнасьці, але і сачыць за выкананьнем правоў чалавека.

У якасьці дзяржавы, з якой у бліжэйшы час магчыма ўзнавіць саюзныя сувязі, Бабурын назваў Беларусь. Каментуючы праблему расейскіх суайчыньнікаў у краінах СНД, лідар РАС зазначыў, што «Расея павіна абараняць сваіх грамадзян усімі сродкамі». На яго думку, неабходна ўвесьці зьмены ў закон аб грамадзянстве, які спрашчае працэс атрыманьня жадаючымі расейскага грамадзянства.

Па словах старшыні РАС, дэнансацыя Дагавору 1922 году аб стварэньні СССР пры прыняцьці Белавежскіх пагадненьняў аб стварэньні СНД несапраўдная, бо ў 1991 годзе палажэньні дагавору ўжо былі канстытуцыйнымі нормамі. Канстытуцыя СССР 1977 году, лічыць Бабурын, у законным парадку не адменена. Ратыфікацыя Белавежскіх пагадненьняў таксама несапраўдная, таму што праведзена Вярхоўным Саветам Расеі, у той час як згодна Канстытуцыі, якая дзейнічала тады, правам ратыфікацыі падобных дакумантаў валодаў адно Зьезд народных дэпутатаў. (Бабурын быў адным з 6 дэпутатаў ВС Расейскай Федэрацыі, якія галасавалі супраць ратыфікацыі пагадненьняў).

На прэс-канферэнцыі С.Бабурын паведаміў таксама, што ў пятай Дзяржаўнай Думе неаднаразова ставілася пытаньне аб дэнансацыі Белавежскіх пагадненьняў, аднак гэтая прапанова не набірала неабходнай колькасьці галасоў.

«Э.-Х.»

29 лютага 1996 г.

17 АУКЦЫЁН

ГРОДНА

па продажу аб'ектаў камунальнай уласнасці г.Гродна

Назва аб'екта, яго адрас	Тэрмін арэнды памяшкання	Агульная плошча (кв.м.)	Пачатковая цана продажу (млн.руб.)
Крама N 56, Гархарчгандлю, вул. Шчорса, 39	10 гадоў	381	141
Крама N 20, Гархарчгандлю, вул. Горкага, 47	10 гадоў	264	149
Кафэ "Чабурэчная" вул. Ажешка, 1	10 гадоў	62	92
Будынак крамы, вул. Краснаармейская, 85	продаж ва уласнасць	642,9	1724
Павілён крамы, вул. Краснаармейская	продаж ва уласнасць	40,5	21
Крама N 34, Гарпрамгандлю пр. Я.Купалы, 34	10 гадоў	382,51	78
Права арэнды памяшкання, вул. Сацыялістычная, 14	10 гадоў	191,86	14

Атрымаць поўную інфармацыю аб аб'ектах і падаць заяву на удзел у аукцыёне можна па адрасу: г.Гродна, пл.Леніна 2/1 пакоі 57, 58. Тэл. (0152) 452-981, 472-956

БЕЛАРУСКІ ФОНД СОРАСА

абвяшчае

конкурсы ў межах

КУЛЬТУРНЫХ ПРАГРАМ

КОНКУРС тэатральных праектаў

Мэта конкурсу - падтрымка пастаноўкі новых спектакляў. У конкурсе маюць права ўдзельнічаць як прафесійныя, так і аматарскія тэатры.

Апошні тэрмін падачы заявак - 25 сакавіка 1996 года.

Увага! *Заяўкі школьных і студэнцкіх тэатраў падаюцца на конкурс Маладзёжнай праграмы Беларускага Фонду Сораса.*

КОНКУРС праектаў, звязаных з правядзеннем мастацтвазнаўчых, культуралагічных і літаратурных канферэнцый, семінараў і іншых імпрэзаў

Апошні тэрмін падачы заявак - 1 красавіка 1996 года.

КОНКУРС праектаў правядзення мастацкіх выставаў (жывапіс, графіка, пластыка, мастацкая фатаграфія) **і мастацкіх акцый**

Апошні тэрмін падачы заявак - 5 красавіка 1996 года.

Увага! *Адпаведныя праекты, звязаныя з дзіцячай творчасцю, падаюцца на конкурс Маладзёжнай праграмы Беларускага Фонду Сораса.*

КОНКУРС «Стварэнне новых канцэртных праграм»

Мэта конкурсу - падтрымка абнаўлення рэпертуару музычных калектываў.

Апошні тэрмін падачы заявак - 25 красавіка 1996 года.

Увага! *У межах конкурсу не разглядаюцца заяўкі аб стварэнні новых эстрадных і шоу-праграм. Праекты, звязаныя з творчасцю дзіцячых і студэнцкіх калектываў, падаюцца на конкурс Маладзёжнай праграмы Беларускага Фонду Сораса.*

Абавязковае патрабаванне: да заяўкі павінны прыкладацца копіі праграм канцэртнай дзейнасці за 1995 год.

КОНКУРС праектаў, звязаных з правядзеннем музычных і харэаграфічных фестываляў і іншых музычна-харэаграфічных імпрэзаў

Апошні тэрмін падачы заявак - 22 красавіка 1996 года.

Увага! *Праекты, звязаныя з правядзеннем дзіцячых і студэнцкіх музычных і харэаграфічных фестываляў падаюцца на конкурс Маладзёжнай праграмы Беларускага Фонду Сораса.*

КОНКУРС «Стварэнне новых харэаграфічных праграм»

Апошні тэрмін падачы заявак - 30 красавіка 1996 года.

Увага! *У межах конкурсу не разглядаюцца заяўкі аб стварэнні новых эстрадных і шоу-праграм.*

Праекты, звязаныя з творчасцю дзіцячых і студэнцкіх калектываў, падаюцца на конкурс Маладзёжнай праграмы.

Абавязковае патрабаванне: да заяўкі неабходна прыкласці копіі праграм канцэртнай дзейнасці за 1995 год.

КОНКУРС «Беларускае мастацтва 90-х гадоў»

(жывапіс, графіка, пластыка, плакат, фотамастацтва, арт-дызайн, манументальнае, дэкаратыўнае мастацтва і мастацтва акцый)

Мэта конкурсу - распрацоўка канцэпцый і стварэнне шэрагу рэпрэзентатыўных альбомаў па названых відах мастацтва.

Апошні тэрмін падачы заявак - 1 ліпеня 1996 года.

Абавязковыя патрабаванні да прапануемай канцэпцыі: максімальная рэпрэзентатыўнасць розных творчых накірункаў; наяўнасць у заяўцы кадраплану (спіс аўтараў твораў і пералік адабраных твораў з указаннем месца іх знаходжання). Максімальная колькасць рэпрадукцый у кожным з будучых альбомаў - трыццаць.

Усе праекты на конкурс Культурных праграм падаюцца ў выглядзе заявак на грант па распрацаванай форме, якую можна атрымаць у Беларускім Фондзе Сораса альбо ў Віцебскім і Гомельскім аддзяленнях БФС.

Заяўкі, якія складзены не па форме, не разглядаюцца.

Праекты дасылаюцца на адрас: ***220027 г. Мінск, пр. Ф.Скарыны, 65, корп. 11А, пак. 517 А, Беларускі Фонд Сораса, з абавязковай пазнакай назвы адпаведнага конкурсу.***

З пытаннямі звяртайцеся па тэлефонах: (0172) 32-80-92, 32-77-13, 32-70-64, 39-91-21, 39-93-46

© Гольфстрым 036

© PDF: Kamunikat.org 2013

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

MEMORIA

КАБ СПАДЧЫНА ЯГО НЕ ПАРАСЛА БЫЛЬЛЁМ

У студзені адзначаўся дзень нараджэньня нашага славутага земляка - Яўхіма Карскага. Але кожныя пражытыя дзянёчкі даюць падставы, каб зьвяртацца зноў і зноў да спадчыны вялікага вучонага. Тут нас падштурхоўвае першая праграма «нацыянальнага» радыё. Ад яго два ранкі запар мы чулі, што ў Горадні адбудуцца міжнародныя чытаньні, «посвящённые Ефимию Федоровичу Карскому, выдающемуся филологу-слависту, славянскому палеографу, этнографу и фольклористу... Жизненный путь ученого связан с Нежином, Киевом, Вильно, Ростовом, Петербургом, Москвой, но родился то он возле Гродно. В чтениях участвуют ученые из России, Белоруссии, Украины и Литвы.»

Між тым, у чытаньнях удзельнічалі і палякі, але аб гэтым радыёанонс не паведаміў. Умаўчаньне пра палякаў уражвае і зьдзіўляе. Справа ў тым, што 18 гадоў (з 70 пражытых) Карскі працаваў у Варшаве, прычым у 1905-1910 г.г. ён быў в ы б а р н ы м (а не прызначаным якім-небудзь Мураёўвым) рэктарам Варшаўскага універсітэту. Дарэчы, у Растове (1915-1916) вучоны апынуўся толькі таму, што туды загнала вайна Варшаўскі універсітэт, у якім Карскі працаваў ардынарным (г.зн. штатным) прафесарам з 1887 г. Больш таго, галоўныя навуковыя працы Карскага ўпершыню ўбачылі сьвет у выдавецтве Варшаўскага універсітэту. Нарэшце, шматлікія экспедыцыі Карскага на Беларусь у былых этнічных межах (сёньня частка тых зямель адыйшла да Браншчыны, Смаленшчыны, Цьвершчыны, Пскоўшчыны, а частка - да Польшчы, Украіны, Летувы) фінансаваліся ўсё тым жа Варшаўскім універсітэтам. Замоўчваньне Варшавы верагодна зьвязана з тым, што там не зусім славяне, або ня тыя славяне. І наконт удзелу беларускіх вучоных таксама цікава. На чытаньнях адсутнічалі прадстаўнікі кафедраў беларускай філалогіі і беларускай культуры Гарадзенскага універсітэту. Магчыма, там заселі ня тыя беларусы.

Наша радыё ведае, аб чым трэба маўчаць, а што трэба абвесьціць абавязкова і не адзін раз. Сьвежы прыклад. Анансуецца прамая сувязь з віцэ-сьпікерам Вярхоўнага Савету Юры Малумавым: ён павінен сказаць , што ўжо амаль паўвеку, як з беларускага радыё вытраўліваюць рускую мову. Трэба рашуча абараняць рускую мову на радыё і тэлевізіі. Да таварыша Малумава ідзе падмога не ад якога-небудзь СС «Белая Русь», а з боку карэспандэнта беларускай рэдакцыі радыё «Свабода» у Менску Галіны Айзенштадт. Яна ў «Свободных новостях плюс» надрукавала вялікі артыкул, у якім «откровения» такога зьместу: "и чего там верещат всякие про «зьнішчэньне» беларускай мовы», если в хорошо знакомой ей Австрии все говорят по-немецки, ничуть не опасаясь, что их таким путём проглотит ФРГ." Спрытная дзяўчынка, гэтая Галіна: і «зялёненькія» зарабляе, і «зайцамі» ня грэбуе. Пачатую Юры Малумавым кампанію-1996 па абароне рускай мовы трэба ўспрымаць як знак набліжэньня новай бяды. Магчыма, што зьнікненьне ўроку ранішняй гімнастыкі пад беларускамоўную аранжыроўку або пагроза над беларускамоўнымі казаньнямі сьвятара з Чырвонага касьцёлу - гэта толькі кветачкі.

Вось у якіх моўных калізіях пройдзе юбілейны год Карскага. Давайце, чытачы, прыгадаем, што зрабіў для Беларусі і беларусаў наш зямляк, чым гэты славіст адметны сярод славістаў наогул, чаму спадчыну трэба сьцерагчы, каб не ўмыкнулі ды не забалабонілі панславісты, каб яны не выкарысталі Карскага ў супрацьлеглым да нас рэчышчы. Забягаючы крыху наперад, скажу: міжнародны аўтарытэт славіста-філолага Карскага дапаможа нам у штодзённай працы дзеля адраджэньня роднай мовы. Адразу трэба падкрэсьліць, што працы Карскага па славянскай палеаграфіі, этнаграфіі і фальклярыстыцы - гэта ня больш, чым спадарожнікі яго асноўнага шматгадовага мэтанакіраванага дасьледаваньня ў галіне менавіта беларускай філалогіі, і гэта ня думка аматара накшталт Г.К., а сьцьвярджэньне вельмі вядомага расейскага (пазьней савецкага) акадэміка, мовазнаўцы-славіста Б.М.Ляпунова. «В оценке ученой деятельности Евфимия Федоровича для нас особенно важно отметить главный памятник его жизни - обширный многотомный труд «Белорусы», равный которому по обстоятельности едва ли найдем в области изучения других славянских народов» - пісаў акадэмік. Тут можна дабавіць, што з прагледжанай мною бібліяграфіі сотні асноўных прац Карскага па філалогіі пасьля 1905 году амаль зьнікаюць словы «северо-западный», «наречие», уступаючы месца тэрмінам «белорусский», «язык».

Хоць элементы беларускай мовы (і старой, і народнай) выкарыстоўваліся ў трактатах такіх асьветнікаў, як Скарына, Цяпінскі, Зізаній і Сматрыцкі, аднак распрацоўкі старабеларускай і сучаснай беларускай мовы ў навуковых мэтах належаць толькі Карскаму. Ён заснавальнік усіх галін беларускай філалогіі, чым і адрозьніваецца ад сваіх папярэднікаў, у тым ліку, напрыклад, і ад І.Насовіча. Карскі першы сярод лінгвістаў дасьледаваў акцэнталогію беларускай мовы, прычым у характэрным для яго гістарычным асьпекце. А што такое націск, ведаю па сабе. Калісьці мне прыйшлося вытраўліваць свой беларускі акцэнт, але ж русакі лёпка лавілі мяне на націсках у некаторых словах, асабліва калі я быў пад «мухаю».

Зразумела, што разьвіцьцё беларускай мовы адбывалася пад уплывам суседзяў. Калі фанетычны і марфалагічны склад нашай мовы ўсталяваўся ў 13-16 стагоддзях, то сінтаксіс і слоўнік працягвалі папаўняцца. І тут, паводле Карскага, найбольшы ўплыў (менавіта ўплыў, а не механічную запазычанасьць) зрабіла польская мова. Важна і другое. Як гісторыку беларускай мовы, Карскаму было спадручна заглянуць у гісторыю беларускай нацыі. «Галоўная маса славян, склаўшых беларускае племя, рухалася з поўдня (з Прыпяці ды яе прытокаў) і захаду (магчыма з Заходняга Бугу і Нарэва) спачатку да Нёмана, адсюль да Заходняй Дзьвіны на поўначы і да Дзясны ды Акі на ўсходзе» (пераклад мой,- Г.К.) - пісаў Карскі ў сваіх «Белорусах» (Вільна, 1904, т.1, стар.63).

Карскі дасьледаваў беларускую мову глыбока і дэталёва. Зьвяртаў ён увагу таксама на запазычанасьці. Тут на першы погляд шмат дзіўнага. Дазвольце крыху прыкладаў. Словы МУЛЯЦЬ або СЯРМЯГА - фінскія, а ХАТА ды САБАКА - скіфскія; ГРЭБАВАЦЬ ды ГНІБЕЦЬ - словы балцкія. Паводле Карскага, нашымі непасрэднымі папярэднікамі былі балты, таму асабліва шмат запазычанасьцяў летувіскага і латышскага кшталту вучоны знайшоў у старабеларускай мове. Цікавыя дасьледаваньні яго аб шляхах пранікненьня раманскіх (французкіх, італьянскіх, румынскіх) слоў, а таксама германізмаў. Апошніх у нашай мове вельмі шмат, а яўрэізмаў значна менш (КАГАЛ, ШАБАС, ХАЛЭЙМУС), таму што з беларусамі яўрэі стараліся гаварыць на нашай мове. Запазычанасьці, выяўленыя Карскім, можна было б доўжыць: цюркскія БАЛАМУТ ды БАРЫШ, кельцкія БОТ ды ТЫН, готскія БОНДАР ды КУЛЬГАЦЬ. Ніколі не падумаў бы, што БАЙСТРУК ды ЯГНЯ - гэта латынь, але ж ня мне спрачацца з самім Карскім. Гэтыя месцы яго лінгвістычных дасьледаваньняў шмат цікавейшыя, чым старонкі «Марксизма и вопросов языкознания» І.Сталіна, якія калісьці нам спачатку зачыталі па радыё, а потым усе студэнты вучылі ў інстытутах.

Няхай некаторыя чытачы ня прымуць за лыжку дзёгцю наступнае: паводле Карскага тэрмін «Белая Русь» узьнік значна раней, чым назва «Великая Русь». Вучоны ганарыўся тым, што па колькасьці старажытных друкаваных кніг беларусы далёка наперадзе ад вялікаросаў. Пашанцавала Карскаму, што не дажыў да таго часу, калі гэтым ён ганарыўся б не ў Пецярбургу, а дзенебудзь на Салаўках або Калыме. Але магчыма і там лінгвіст Карскі знайшоў бы цікавую справу, таму што па апантанасьці ў навуцы яго можна параўнаць хіба што з Архімедам. А, як кажа сіракузкая легенда, стары Архімед папрасіў рымскага цэнтурыона трохі пачакаць з забойствам, бо ён (Архімед) зараз дакажа цікавую тэарэму.

Цяжка спыніцца, калі пішаш пра Карскага, але прыходзіцца закругляцца. Каб неяк скончыць пералік яго навуковых заслугаў, падкрэсьлім, што аўтарытэт вучонага быў такі вялізны, калі кожны філолаг лічыў за гонар атрымаць рэцэнзію на сваю працу ад Карскага. Вучоны зрабіў нашу мову ды саміх беларусаў неад'емнымі аб'ектамі дасьледаваньня славістаў любой заходняй краіны. Дарэчы, у 20-я гады Карскі пазначыў для замежных славістаў-беларусістаў план дасьледаваньня, як аб гэтым сьведчыць зьмест яго артыкулаў у Zeitschrift für slavische Philologie, 1925, Band I, S. 429-432 і Revue des etudes slaves, Paris, 1927, t. VII, fasc. 1-2, p. 22-26.

Зьвяртаючыся да моўнай сітуацыі, у якой праходзяць угодкі Карскага, нельга ня браць пад увагу яе магчымыя наступствы ў сацыяльным і грамадзкім ракурсе. Гэта вельмі пераканаўча аналізуе Сяргей Дубавец у газеце «Свабода» (N 5 ад 26 студзеня 1996 г.) Аўтар ведае, аб чым піша. Менавіта яму належыць цікавая рэцэнзія твора адной рускай дамы, выдадзенага ў Пецярбургу ў 80-я гады мінулага стагоддзя. Раман «Обрусители» сударыні Н.Ланскай апісвае культурную і сацыяльна-эканамічную сітуацыю на Беларусі пад управаю М.Н.Мураўёва («вешацеля») ды яго памагатых. Факталогія твору Ланскай уразіла мяне тым, што становішча Беларусі 70-80 г.г. 19 стагоддзя па сіле разбуральнасьці аналагічнае сёньняшняму. У гэтым чытач пераканаецца, калі пачытае часопіс «Нёман» N 1 за 1994 г. (стар.151-162).

У артыкуле ж «Война и мир» (газета «Свабода») Сяргей Дубавец піша (цытую тут і далей на мове арыгіналу): «...языковая проблема - это ведь не только слова или там произношение. Это проблема психологического состояния человека. Каждый язык - весьма специфический и закрытый комплекс со всей гармонией, ассоциативной системой и т.д. Каждый язык - это и есть собственно мышление. Если вы не языковед, вы просто не вынесете постоянного, ежечасного смешения языков, которое приводит сначала к дискомфорту, а затем к шизофреническому расколу сознания. Конечно, если человек в принципе далёк от какой-либо культуры, то ему всё равно, что у него во рту. Многим для общения достаточно трёх матерных корней или той «трасянкі», которой изъясняется наше начальство. Но белорусскоязычный гражданин - это, как правило, человек, чьё сознание глубоко укоренено в традиции, близко к природе и истории своей земли. И для него упомянутая тирания языковой эклектикой неизбежно угрожает психологическим дискомфортом. То же самое, впрочем, можно сказать и о людях русской культуры, которых в Беларуси не так много, и для которых наш языковой винегрет не менее невыносим».

С.Дубавец падкрэсьлівае, што дыскрымінацыя беларускай мовы - гэта фундамант пад нацыянальны канфлікт. Затым ён піша: «А национальный конфликт в самых тёмных глубинах своих - это конфликт крови и оперирует он кровавыми средствами, как мы видим на множестве примеров других стран. Пока же в Беларуси народ не ответил на провокацию президента и не благодаря, а вопреки ему сохранил мир».

Думку Дубаўца працягну ўласнымі разважаньнямі: сёньня крывавы зыход нацыянальнага канфлікту стаў бы для нас большай катастрофай, чым Чарнобыль. На Беларусь скінуты сотні тысяч зязюлянят Савецкай Арміі (з Вугоршчыны, Чэхіі і Славакіі, Усходняй Нямеччыны ды Польшчы). План скіду па Беларусі выкананы на 200%, а па Расеі толькі на 98%. Пакуль што гэтыя зязюляняты толькі маладыя ваенныя пенсіянеры. Яны «наиболее социально незащищенные» і таму хутка аб'ядналіся ў саюз афіцэраў, каб у любы момант стаць «на защиту отечества». Уяўленьне гэтых афіцэраў аб айчыне акрэсьлена радкамі песьні: «Мой адрес не дом и не улица, мой адрес - Советский Союз». Іхныя «отцы-командиры» ганарацца перамогамі: Берлін (1953), Будапешт (1956), Прага (1968). Белград (1950) - не атрымаўся (магчыма, дзякуючы аўтарытэту Ціто), але «Югославская трагедия», хоць і не па фабуле праслаўтага рамана, узьнікла ў 90-я гады. Гарматны гул вакол Сараева - гэта знаёмы голас «борцов за мир во всём мире». У былых «освободителей» Эўропы і «турыстаў на танках» рукі сьвярбяць па зброі, а пах чужой крыві прыемна хвалюе іх кроў. І мы, цывільныя пеньсіянеры, хоць і моцна сацыяльна абароненыя, будзем зьнішчаны за адну ноч, калі з каменьнямі ў руках пойдзем змагацца за прыярытэт беларускай мовы.

Сёньня трэба шукаць і альтэрнатыўныя шляхі захаваньня незалежнасьці Беларусі. Ад нашых рупліўцаў - Васіля Быкава, Ніла Гілевіча, Ганны Сурмач, Зянона Пазьняка і яго народнафронтаўцаў - маюцца пэўныя прапановы. Але адзін з шляхоў да Беларусі яшчэ не абмяркоўваўся, хоць ён вядомы ў эўралейскай гісторыі. Я маю на ўвазе лёс Нарвегіі. Гістарычныя паралелі (менавіта паралелі, а не аналогіі) проста напрошваюцца: с л а в у т а я мінуўшчына, потым заняпад пад уладаю чужакоў, затым атрыманьне незалежнасьці. Фінал неаднолькавы. Нарвегія ня толькі ўтрымала, але і канчаткова замацавала сваю незалежнасьць, а Беларусь страчвае яе штодзённа. І ня толькі таму, што н е з а л е ж н а с ь ц ь звалілася як манна нябесная, што высыпаў нам на голаву «ГКЧП» (віват Янаеву!).

Дазвольце мініэкскурс у гісторыю Нарвегіі. Краіна вікінгаў (8-11 стагоддзі) паступова страчвае самастойнасьць. Яна апынулася пад уладаю Данії і Швецыі. У 1814 годзе Данія «уступіла» свае правы Швецыі. Апошняя «адмовілася» ад пратэктарату над Нарвегіяй у 1905 годзе (Карльстацкі дагавор). Такім чынам, краіна вікінгаў вярнула сабе незалежнасьць больш чым праз 500 гадоў пасьля страты. Трэба падкрэсьліць, што рашаючую ролю ў атрыманьні суверэнітэту адыграў рост міжнароднага прэстыжу нарвежцаў, і не ў апошнюю чаргу такіх славутых дзеячоў культуры, як Э.Грыг ды Г.Ібсэн, палярных дасьледчыкаў, як Ф.Нансэн ды Р.Амундсэн, такіх вучоных як хімік П.Вааге ды мікрабіёлаг Г.Хансэн. Прыклад нарвежцаў, пранёсшых праз шмат вякоў свой цяжкі крыж да незалежнасьці, падказвае нам наступнае. Калі на Беларусі зьявяцца сусветна вядомыя дзеячы навукі і культуры, то мы атрымаем незалежнасьць хутчэй, чым шляхам сутычак з воінствам саюзу афіцэраў і саюзу «беларускіх» казакоў.

Зразумела, што нашыя славутасьці зьявяцца ня сёлета. Перашкод будзе шмат, у тым ліку і ордэна Леніна Акадэмія Навук БССР. Ашыванцы з гэтай акадэміі - дрэнныя кандыдаты ў зоркі сусьветнай навукі. Чытач можа меркаваць па членах-карэспандэнтах акадэміі Г.Карпенку і С.Шушкевічу. Пакуль мы маем толькі аднаго сусьветна вядомага вучонага беларускага паходжаньня - Яўхіма Карскага. І тым беларусам, што сказалі на рэферэндуме сваё цьвёрдае «НЕ», трэба зрабіць усё магчымае, каб памяць аб вялікім патрыёце Беларусі не зарасла травою забыцьця. Тут ёсьць вельмі просты выхад, бясспрэчна прыймальны нават для арганізатара рэферэндуму. Трэба прысвоіць імя Карскага Беларускаму Дзяржаўнаму Універсітэту.

Па-першае, менавіта Карскі большую частку свайго жыцьця ахвяраваў на тое, каб навуковым пошукам пераканаць усіх, што ёсьць на сьвеце беларусы, якія гавораць на аўтэнтычнай мове (на жаль, цяпер ужо на «трасянцы», у лепшым выпадку - на «наркомаўцы»).

Па-другое, ніхто іншы, як сам Карскі, быў старшынёю камісіі па арганізацыі і адкрыцьці ў Менску БДУ, чым зьдзейсьніў сваю запаветную мару: «Які багаты ўраджай знайшла б для сябе тут універсітэцкая навука» (пераклад мой, Г.К.), - пісаў вучоны ў сваіх «Белорусах».

Па-трэцяе, нашаму прэзідэнту, як вялікаму прыхільніку славянства, унутраны голас павінен прадыктаваць указ аб прысваеньні БДУ імя славіста Карскага.

Нарэшце, і патрыяршаму экзарху Філарэту, як захавальніку праваслаўя і славянства на Беларусі, ня грэх асьвяціць шыльду з імем Карскага на універсітэце і прасьляваць: «Отныне, и присно, и во веки веков Аминь». Амінь!

Г.К.

© PDF: Kamunikat.org 2013

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

праграма тэлерадач

Панядзелак, 26 лютага

Белорусское телевидение

7.30 Утренний коктейль. 7.50 Экономикст. Недвижимость. 8.00 «Вечное утро оперетты». Музыкальный фильм. 9.00 Мультфильм. 9.20 «Али-Баба и разбойники». Спектакль Государственного театра кукол Латвии. 10.30 «Александр Галич. Изгнание». Док. фильм. 12.00 «Вдохновение». Фильм-концерт. 12.30 «Визит к Минотавру». Пятисерийный худ. фильм. 1-я серия. 15.00 Новости. 15.15 Мультфильмы. 15.35 ТВ - школе. История Беларуси. 8-й класс. Белорусское национально-освободительное движение в 1905-1907 г.г. 16.05 Родовод. «Масленица». 16.50 Педагогический экран. Воспитание в семье. 17.20 К 100-летию народного писателя Беларуси Кондрата Крапивы. Алесь Петрашкевич. «К.Крапива в моей жизни». 17.50 Музыкальный антракт. 18.00 Телеанонс. 18.05 «На добрый лад». Передача из Гродно. 18.25 Экономикст. Недвижимость. 18.35 «Трижды один». Музыкальная передача MTV. 18.50 Новости (с сурдопереводом). 19.05 «Крок». «Риск-версия». Телеигра. 19.40 «Это мы не проходили...» Экономическая программа. 19.55 «Беларусь - Россия: пути сближения». Круглый стол с руководителями российской прессы. 20.40 Колыбельная. 21.00 Панорама. 21.55 Спортивный телекурьер. 22.15 Фильмотека. «Свадьба старшего брата». Худ.фильм. 23.25 «Творцы». Дмитрий Смольский: автопортрет с учениками. 0.10 Новости. ГРОДНО: 17.20 Неделя. Информационная программа. 18.25 Семейный понедельник.

ОРТ

5.00 Телеутро 8.00 Новости 8.15 Секрет тропиканки». Сериал 9.05 «Поле чудес» 9.55 Человек и закон 10.20 «Мой приятель светофор». Мультфильм 10.30 «Угадай мелодию». . 11.00 Новости (с сурдопереводом) 11.10 В эфире телерадиокомпания «Мир». «Сохрани себя» 11.50 «ТАСС уполномочен заявить...» 5-я серия 12.55 «Подушка для солнышка». Мультфильм 13.10 «Т.С.Н». Сериал 14.00 Новости (с сурдопереводом) 14.20 «Драконы подземелий». Мультсериал 14.40 Марафон-15 15.00 Звездный час 15.35 «Элен и ребята». Молодежный сериал 16.00 Джэм 16.30 «Семь дней спорта» 17.00 Новости 17.20 Секрет тропиканки». 18.10 Часпик 18.35 «Угадай мелодию». 19.00 «Если». Ведущий-В.Познер. 19.45 «Спокойной ночи, малыши!» 19.55 Реклама 20.00 Время 20.30 «Операция» 20.50 Криминальный сериал «Метод Крекера». 21.45 Дикое поле 22.00 «Серебряный шар». Ведущий-В.Вульф 22.40 Новости 22.50 Линия кино. Фильм Сергея Ливнева «Кикс»

Канал «Россия»

16.00, 19.00, 22.00 Вести. 16.20 Новая линия. 16.50 Непопулярная тема. 17.00 От «винта». 17.15 Спасение 911. 18.10 L-клуб. 19.25 Подробности. 19.35 «Счастливые семьи». Худ.фильм (Великобритания). Часть 2-я. 20.40 Репортер. 21.05 Без ретуши. 22.30 Торговый дом. 22.35 Река времени. 22.40 Автомиг. 22.45 «Спрут-6». Худ.фильм (Италия). 3-я серия.

Санкт-Петербург

17.00, 19.45 Музыкальный момент. 17.05 «Наша Валерия Сергеевна». К 80-летию народной артистки России В.С.Киселевой. 18.05 Телеблиц. 18.10 Большой фестиваль. 18.30, 21.45 Информ ТВ. 18.50 Спортивные новости. 18.55 «Гром в раю». Худ. фильм. 19.50 Телеслужба безопасности. 20.00 Т.Догилева и Э.Марцевич в худ. фильме «Пчелка» (Россия). 21.25 Экспресс-кино. 22.00 Спорт, спорт, спорт... 22.15 «Телекомпакт». Музыкальное шоу. 22.55 Овертайм. 23.10 Хоккей. Чемпионат МХЛ. СКА (Санкт-Петербург) - «Металлург» (Магнитогорск). 3-й период.

Польское телевидение

Программа 1

07 00 Кофе или чай? 08 45 Беседа. 09 00 «Мода на успех». Сериал пр-ва США. 09 30 Телетурнир для детей. 10 00 Новости. 10 10 Мама и я. 10 25 Гимнастика для дыхания. 10 30 Дошкольники дома. 10 55 Поговорим о детях. 11 05 «Доктор Квинн». Сериал пр-ва США. 11 50 Музыкальная программа. 12 15 Дети, такие, как и наши. 12 30 Мир людей. 13 00 Новости. 13 10 Агробизнес. 13 15 Индекс. 13 40 Образовательная информация. 13 45 Школа. 14 05 Телекомпьютер. 14 20 Клипер. 14 35 Лаборатория. 14 55 В райском саду. 15 10 Репортаж. 15 30 Третье измерение. 15 50 Программа дня. 16 00 Для молодых зрителей. 16 30 «Мода на успех». Сериал пр-ва США. 17 00 Программа для молодежи. 17 25 Программа для детей. 17 50 Календарь XX века. 18 00 Телеэкспресс. 18 20 Публицистическая программа. 19 10 «Марфи Браун». Сериал пр-ва США. 19 35 Тележурнал. 20 05 Вечеринка. 20 30 Новости. 21 10 Телетеатр. 23 20 Пульс дня. 23 35 Неделя президента. 23 45 Тележурнал. 00 10 Новости. 00 30 Репортаж. 00 45 «Мамма Рома». Фильм пр-ва Италии. 02 30 Развлекательная программа.

Программа 2

08 00 Панорама. 08 10 Спортивная программа. 08 15 Утренний гость. 08 50 Академия здоровья. 09 00 Местная программа. 09 30 «Здровко». Сериал пр-ва США. 10 00 Мир женщин. 10 30 Наша большая семья. 11 00 Кроссворд. 11 25 Спортивная программа. 11 35 Телетурнир. 11 50 Летный журнал. 12 20 Сообщество в культуре. 13 00 Биографии. 14 00 Панорама. 14 20 «Счастье со второй руки». Сериал пр-ва Канады. 15 10 Рок-журнал. 15 40 Музыкальные новости. 15 55 Приветствие. 16 00 Мультсериал. 16 25 Академия здоровья. 16 35 Спортивное хобби. 17 00 Твой телефон безопасности. 17 30 Быть Моцартом. 18 00 Документальный сериал. 19 00 Панорама. 19 10 Местная программа. 20 05 Колесо фортуны. 20 30 Программа для детей. 21 00 «Здровко». Сериал пр-ва США. 21 30 Автожурнал. 22 00 Панорама. 22 30 Спортивная программа. 22 40 «На бездорожье счастья». Сериал пр-ва Германии. 23 30 Сад искусств. 00 00 Репортеры представляют. 00 30 997. 01 00 Панорама. 01 05 Матильда Кшесинская.

Аўторак, 27 лютага

Белорусское телевидение

7.30 Утренний коктейль. 7.50 Экономикст. 8.00 Новости. 8.15 Авто-парк. 8.30 Бездельник. 9.00 ТВ - школе. История Беларуси. 8-й класс. Белорусское национально-освободительное движение в 1905-1907 г.г. 9.30 «Вестгейт». Телесериал (США). 10.25 Мультиклуб. 11.45 «Капитан», «Кончилось лето». Короткометражные фильмы. 12.35 «Загадка руки». Док.фильм. 12.55 «Визит к Минотавру». Худ.фильм. 2-я серия. 15.00 Новости. 15.15 Торговый дом. 15.30 ТВ - школе. Музыка и пение. 6-й класс. Музыкальный образ. 16.00 Сельчане. 16.30 «23 градуса 40 минут на восток от Гринвича». 17.15 Телеанонс. 17.20 Уроки Н.Новожиловой. 17.50 Музыкальный антракт. 18.00 «Все про все». Информационно-познавательная программа для детей. 18.25 Экономикст. 18.35 «Трижды один». Музыкальная передача MTV. 18.50 Новости (с сурдопереводом). 19.05 Чернобыль: проблемы и решения. Принимает участие заместитель министра по чрезвычайным ситуациям и защите населения от последствий катастрофы на ЧАЭС Республики Беларусь И.В.Ролевич. Прямая линия. 19.40 «Вестгейт». Телесериал (США). 20.40 Колыбельная. 21.00 Панорама. 21.55 Музыкальный антракт. 22.05 «Звезды» на экране. О.Кабо в худ. фильме «Умирать не страшно». 23.50 Супергол. 0.15 Новости. ГРОДНО: 17.15 Так говорит Библия. 17.45 Телекабинет власти. 18.10 Дневник Принеманья. 18.20 Вечерний канал. Информационно-музыкальная программа.

ОРТ

5.00 Телеутро 8.00 Новости 8.15 Секрет тропиканки». 9.05 «Ненависть: Дети лжи». Телефильм. 10.00 Смехопанорама. Ведущий-Е.Петросян 10.30 «Угадай мелодию». . 11.00 Новости (с сурдопереводом) 11.10 В эфире телерадиокомпания «Мир». «Мы и рынок» 11.50 «ТАСС уполномочен заявить...» 6-я серия 13.00 «Мы рисуем». Мультфильм 13.10 «Т.С.Н». 14.00 Новости (с сурдопереводом) 14.20 «Драконы подземелий». 14.40 Кварьете «Веселая квампания» 14.50 Мультитроллия 15.10 Волшебный мир, или Синема 15.35 «Элен и ребята». 16.00 ...До шестнадцати и старше 16.30 «Семь дней спорта» 17.00 Новости 17.20 Секрет тропиканки». 18.10 Часпик 18.35 «Угадай мелодию». 19.00 Тема 19.45 «Спокойной ночи, малыши!» 19.55 Реклама 20.00 Время 20.30 «Операция» 20.50 Вера Марецкая в фильме «Сельская учительница» 22.40 «Москва - Кремль» 23.00 Новости 23.10 «Золотое сечение». Ведущая Анастасия Вертинская. 23.40 «Т.С.Н». Сериал 0.35 «Семь дней спорта» 1.05 «Трест, который лопнул». 1-я серия

Канал «Россия»

16.00, 19.00, 22.00 Вести. 16.20 Новая линия. 16.50 Клип-антракт. Группа «Дюна». 16.55 Лидер-прогноз. 17.25 Устами младенца. 17.55 Кино с продолжением. «Петербургские тайны». 19.25 Подробности. 19.35 «Одиноким предоставляется общежитие». Худ. фильм. 21.05 Киноафиша. 21.30 Рек-тайм. 21.45 Экран криминальных сообщений. 22.30 Торговый дом. 22.35 Река времени. 22.40 Автомиг. 22.45 «Спрут-6». Худ.фильм (Италия). 4-я серия. 23.45 Виниловые джунгли.

Санкт-Петербург

12.00, 15.30, 18.30, 21.45 Информ ТВ. 12.10 «Гром в раю». Худ.фильм. 12.55, 15.10, 19.45 Музыкальный момент. 13.00 Скорая помощь. 13.30 Путешествие по Востоку. 13.40 «Пчелка». Худ. фильм (Россия). . 15.15 Стиль жизни. 15.40 «Немецкая волна». 16.00 Овертайм. 16.15 Экспресс-кино. 16.30 Детское ТВ. «Три колеса, фолиант и ...» 17.00 По всей России. 17.10 Показывает Ленинградская областная телекомпания. 18.10 Большой фестиваль. 18.50 Спортивные новости. 18.55 «Гром в раю». Худ.фильм. 19.50 Телеслужба безопасности. 20.00 «Человек свиты». Премьера худ. фильма (Латвия). 21.30 «Гжель». Премьера видеофильма. 22.00 Спорт, спорт, спорт... 22.15 Дом кино. Джина Лоллобриджида, Лев Додин. Виктор Розов, Тонино Гуэрра и другие.

Польское телевидение

Программа 1

07 00 Кофе или чай? 08 45 Беседа. 09 00 Мультсериал. 09 30 Телетурнир. 10 00 Новости. 10 10 Мама и я. 10 25 Гимнастика. 10 30 Дошкольники дома. 10 55 Поговорим о детях. 11 00 «Доченьки миллионера». Сериал пр-ва США. 11 50 Музыкальная программа. 12 00 Рынок труда. 12 20 Тележурнал. 12 30 Киножурнал. 12 50 Домашний юрист, 13 00 Новости. 13 10 Агробизнес. 13 15 Точные науки. 13 45 Телекомпьютер. 14 00 Удовольствие и боль. 14 30 Фантастические повести. 14 50 Квант. 15 10 Книга незнаний. 15 35 Атом, звезды, жизнь. 15 50 Программа дня. 16 00 Развлекательная программа. 16 30 «Новые приключения Черного Князя». Сериал пр-ва Австралии. 17 00 Программа для молодежи. 17 25 Программа для детей. 17 50 Календарь XX века. 18 00 Тележспресс. 18 20 Он или кто. 19 00 «Не от мира сего». Сериал пр-ва США. 19 30 Чрезвычайный пересмотр. 20 00 Вечеринка. 20 30 Новости. 21 10 «Плэйбойз». Фильм пр-ва США. 23 00 Пульс дня. 23 15 Сеймограф. 23 25 Люди, власть, деньги. 00 00 Новости. 00 20 Жизнь моя. 01 10 Документальный фильм.

Программа 2

08 00 Панорама. 08 10 Спортивная программа. 08 15 Утренний гость. 08 50 Академия здоровья. 09 00 Местная программа. 09 30 «Фитнесс клуб». Сериал пр-ва Польши. 10 00 Мир женщин. 10 30 Документальный сериал. 11 00 Программа для детей. 11 25 Телетурнир. 11 50 Путешествия во времени и пространстве. 12 50 Спортивная студия. 13 10 Репортаж. 14 00 Панорама. 14 20 «Запретная любовь». Сериал пр-ва Испании. 15 10 Спортивная студия. 15 40 Музыкальные новости. 15 55 Приветствие. 16 00 Сериал пр-ва Канады. 16 25 Академия здоровья. 16 35 Спортивная студия. 17 00 Обзор кинохроник. 17 35 Телетурнир. 18 00 Тележурнал. 18 10 Публицистическая программа. 18 40 Католическая программа. 19 00 Панорама. 19 10 Местная программа. 20 05 Телетурнир. 20 30 Программа для детей. 21 00 Концерт. 22 00 Панорама. 22 30 Спортивная программа. 22 40 Экологическая программа. 22 50 Репортеры представляют. 23 15 Академия польского кино. 01 00 Панорама. 01 05 «Портрет на память». Фильм пр-ва Италии.

Серада, 28 лютага

Белорусское телевидение

7.30 Утренний коктейль. 7.50 Экономикст. 8.00 Новости. 8.15 «Жизнь-явление космическое». Док. фильм. 9.00 ТВ - школе. Музыка и пение. 6-й класс. Музыкальный образ. 9.30 «Вестгейт». Телесериал (США). 10.25 Зорная ростань. Телеконкурс молодых артистов эстрады. 10.55 Видимо-невидимо. 11.55 «Вечерний звон». Док. фильм. 12.45 «Визит к Минотавру». Худ.фильм. 3-я серия. 15.00 Новости. 15.15 Мультфильмы. 15.40 «Про Иванушку-дурачка». Спектакль Белорусского театра юного зрителя. 17.00 ТВ - школе. Репортаж с 1Х Международного конгресса по эффективным педагогическим технологиям образования. 17.20 Гости в дом. 17.50 Музыкальный антракт. 18.00 Кредо. 18.15 «В семье растет дочь». Киноочерк. 18.25 Экономикст. 18.35 «Трижды один». Музыкальная передача MTV. 18.50 Новости (с сурдопереводом). 19.05 Параграф. Рынок труда. 19.30 Телеанонс. 19.40 «Вестгейт». Телесериал (США). 20.40 Колыбельная. 21.00 Панорама. 21.55 Музыкальный антракт. 22.05 К.Денев, С.Морсо, Ж.Депардье в трехсерийном худ. фильме «Форт Саган» (Франция). 1-я серия. 23.10 Королевская охота. 23.50 «Мгновение радости». Киноочерк. 24.00 Новости. ГРОДНО: 17.50 Дневник Принеманья. 18.05 Беседа по случаю. 18.20 «Гостинец». Программа для молодёжи.

ОРТ

5.00 Телеутро 8.00 Новости 8.15 Секрет тропиканки». 9.10 «Тема» 9.55 «В мире животных» (с сурдопереводом) 10.30 «Угадай мелодию». . 11.00 Новости (с сурдопереводом) 11.10 В эфире телерадиокомпания «Мир». «Контакт - деловое сотрудничество стран Содружества» 11.50 «ТАСС уполномочен заявить...» 7-я серия 13.10 «Т.С.Н». 14.00 Новости (с сурдопереводом) 14.20 «Драконы подземелий». 14.40 Кактус и К 14.50 До-ми-соль 15.10 Зов джунглей 15.35 «Элен и ребята». 16.00 «Тет-а-тет» 16.30 «Семь дней спорта» 17.00 Новости 17.20 Секрет тропиканки». 18.10 Час пик 18.35 «Угадай мелодию». 19.00 «Чтобы помнили...» Л.Быков. Ведущий - Л.Филатов 19.45 «Спокойной ночи, малыши!» 19.55 Реклама 20.00 Время 20.30 «Операция» 20.50 Леонид Быков в фильме «В бой идут одни старики». 22.25 «Звезда» представляет... 22.40 Мужчина и женщина 23.20 Новости 23.30 «Т.С.Н». Сериал 0.25 «Семь дней спорта» 0.55 «Трест, который лопнул». 2-я серия

Канал «Россия»

9.05 «Санта-Барбара». Худ.фильм. 10.00, 16.00, 19.00, 22.00 Вести. 10.20 Милицейская хроника. 10.30 «Кучугуры и окрестности». Передача 7-я. 10.50 «Волшебный школьный автобус». Мультсериал. 11.15 Новая линия. 15.05 Там-там новости. 15.20 Праздник каждый день. 15.30 Чья сторона? 16.20 Дальний Восток. 16.50 Вас приглашает фирма. 17.05 Никто не забыт. 17.10 Кипрас Мажейка. «Параллели». 17.25 Своя игра. 17.55 Кино с продолжением. «Петербургские тайны». 19.25 Подробности. 19.35 «Санта-Барбара». Худ.фильм. 20.30 Подиум. 21.10 Чрезвычайный канал. 22.30 Торговый дом. 22.35 Река времени. 22.40 Автомиг. 22.45 Лад-экран. 23.40 Бал прессы.

Санкт-Петербург

12.00, 15.30, 18.30, 21.45 Информ ТВ. 12.10 «Гром в раю». Худ. фильм. 12.55, 15.10, 19.45, 21.00 Музыкальный момент. 13.00 Скорая помощь. 13.30 Советы садоводам. 13.40 «Человек свиты». Худ. фильм (Латвия). 15.15 Стиль жизни. 15.40 «Немецкая волна». 16.00 Ток-шоу «Наобум». Д.Ольбрыхский. 16.30 Телеблиц. 16.35 Детское ТВ. «Маленькие звездочки». 17.10 Показывает Ленинградская областная телекомпания. 18.10 Большой фестиваль. 18.50 Спортивные новости. 18.55 «Гром в раю». Худ.фильм. 19.50 Телеслужба безопасности. 20.00 Час мэра. 21.05 Блеф-клуб. 22.00 Спорт, спорт, спорт... 22.15 «Роль за кадром». Памяти редактора музыкальных телефильмов Д.И.Петлиной. 22.50 Хоккей. Чемпионат МХЛ. СКА (Санкт-Петербург) - «Салават Юлаев» (Уфа). 3-й период.

Польское телевидение

Программа 1

